У ПІСЬМЕННІКІ ПАЙДУ, НЯХАЙ МЯНЕ НАВУЧАЦЬ

ЧЫРВОНКА

У ГЭТЫЯ ГАДЫ – ВЕЧНА МАЛАДЫ!

ЧЫРВОНКА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 ВЕРАСНЯ 2022 г. ЧАЦВЕР № 176 (29798)

ЛІЧБА ДНЯ

9,011 млн тон

збожжа з улікам рапсу намалочана ў краіне на ўчарашні дзень, паведаміла Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Гэта на 1,5 млн больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Ураджайнасць збожжавых у цэлым па краіне таксама вышэйшая за мінулагодні паказчык. Рапс у Беларусі ўбралі з 342 тысяч гектараў, што складае 95,4 % да ўборачнай плошчы, намалаціўшы 873 тысячы тон пры сярэдняй ураджайнасці 25,5 ц/га. Без уліку гэтай культуры ўсімі катэгорыямі гаспадарак намалочана 8,138 млн тон збожжа. Збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы) у сельскагаспадарчых арганізацыях сабраны з 2,140 млн гектараў, што складае 98,7 % ад плана. У Брэсцкай вобласці ўбрана 99,1 працэнта плошчаў, Віцебскай вобласці — 97,8 працэнта, Гомельскай — 99,5 працэнта, Гродзенскай — 98,6 працэнта, Мінскай і Магілёўскай — па 98,7 працэнта.

Будзе цёпла

Фота БелТА.

Беларусь займае трэцяе месца ў свеце па аб'ёмах здабычы торфу. Патрэбы ўнутранага рынку ў тарфяной прадукцыі задавальняюцца ў поўным аб'ёме. Запасы ацэньваюцца ў 2,4 мільярда тон, з якіх для прамысловай распрацоўкі прыдатныя 302,1 мільёна тон. На тарфяных радовішчах Беларусі падраздзяленнямі «Белпаліўгаза» здабыта больш за два мільёны тон торфу.

На здымку: **кіроўца пагрузчыка Сяргей ПАЛАЧАНІН.**

КАРАТКА

- Юлія Комлева перабрана старшынёй Беларускага саюза канькабежцаў.
- **На Беларускай таварнай біржы пачалася рэалізацыя плодаагародніннай прадукцыі новага ўраджаю.**
- Фізасобы ў Беларусі ў жніўні прадалі на $54,5 млн валюты больш, чым купілі.
- **Гістарычны будынак аршанскай друкарні прададзены на аўкцыёне амаль за Br573 тысячы.**
- Беларусь пяройдзе да рэферэнтнага цэнаўтварэння на лекі.

Зварот у рэдакцыю

ЛЕСВІЦА З ПРАЦЯГАМ,

або Чаму жыхарам мікразоны Падгорная ў Магілёве ўвесь час прыходзіцца нагадваць пра сябе

Пра гэты стратэгічны аб'ект мы пісалі летась у кастрычніку. Староста мікразоны і жыхар Падгорнай Аляксандр ПІКУЛЯ прасігналізаваў пра аварыйны стан лесвіцы, якая звязвае ніжні горад (прыватны сектар, што знаходзіцца ў нізіне) з верхнім. Яго падтрымала шмат людзей. Якраз там, на месцы, і адбывалася наша размова. У газеце выйшаў крытычны матэрыял на гэтую тэму. А нядаўна Пікуля зноў патэлефанаваў і прапанаваў прыехаць. Маўляў, аб'ект гатовы.

Прыязджаю і не пазнаю нашай лесвіцы. Зроблена, як той казаў, на сумленне.

«Калі параўноўваць з тым, што было, дык нашы жыхары кажуць: дабіў жа», — задаволена ўсміхаецца Аляксандр Пікуля. У яго яшчэ ёсць заўвагі, але пра гэта ніжэй.

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ігар СЕРГЕЕНКА:

«Стварыць умовы для замацавання маладых спецыялістаў у рэгіёнах»

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ігар Сергеенка прыняў удзел у пасяджэнні Любанскага раённага выканаўчага камітэта па маладзёжнай палітыцы і сацыяльна-эканамічным развіцці.

«Маладзёжная палітыка — адзін з прыярытэтных напрамкаў усёй дзяржаўнай палітыкі нашай краіны, — сказаў ён. — Вядзецца вялікая работа. Для гэтага сфарміравана, існуе і ўдасканальваецца заканадаўчая база».

Ігар Сергеенка звярнуў увагу, што ў паўсядзённай працы дзяржаўныя служачыя могуць забываць кропкава звярнуць увагу на пытанні, звязаныя з рэалізацыяй маладзёжнай палітыкі, але адміністрацыям прадпрыемстваў, значную частку калектываў якіх складае працоўная моладзь, важна ўдзяляць увагу рабоце з ёй. Без гэтага, лічыць кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, не будзе прагрэсу і перспектыў.

«Мне вядома найбагацейшая гісторыя Любанскай зямлі, на тэрыторыі якой у тым ліку зараджаўся партызанскі рух у 1941 годзе. Пасля вайны вашы землякі славілі гэтую зямлю. У Любанскім раёне працавала нямала Герояў Сацыялістычнай Працы. Тут ёсць прыклады, на якіх можна выхоўваць моладзь. Але для маладых спецыялістаў важна стварацца умовы і магчымасці для работы», — сказаў ён.

Замацаваць усіх маладых спецыялістаў у рэгіёнах не ўдасца, заўважыў Ігар Сергеенка, але гэта не самамэта — важна, каб у невялікіх населеных пунктах не спынялася жыццё.

Не менш важнае пытанне мэтавых накіраванняў, якое, як адзначыў кіраўнік Адміністрацыі, трэба вывучыць у маштабах краіны. Яно цесна звязана з пытаннямі сацыяльнай справядлівасці і гарантыямі для працоўнай моладзі.

Блізкая ўлада

Пытанняў становіцца менш

На чарговы прыём грамадзян, які старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА праводзіць кожную першую сераду месяца, гэтым разам запісаліся ўсяго два чалавекі.

Зямельнае пытанне стала прычынай звароту фермера з Магілёва. Шматдзетны бацька папрасіў садзейнічання ў выдзяленні яго сялянска-фермерскай гаспадарцы 300 гектараў зямлі ў раёне агракамбіната «Усход», якія, па яго словах, доўгі час не апрацоўваюцца. Фермер паведаміў, што ў яго ёсць адпаведны бізнес-план, сельскагаспадарчая тэхніка, і ён збіраецца вырабляць багатую бялком травяную муку, а зімой — саламяныя пелеты. Выбар месца ён аргументаваў тым, што гэта блізка ад дома, а ён бацька васьмярых дзяцей.

Нягледзячы на тое, што аграгаспадарка з'яўляецца ўласнікам абазначаных фермерам гектараў, Анатоль Ісачанка не выключыў магчымасці перадаць яму іх. Але з умовай, што ён дапрацуе свой бізнес-план і гарантуе бесперапынны працэс працы. Каб зямля апрацоўвалася, а вытворчасць функцыянавала.

Яшчэ адзін заяўнік звярнуўся да старшыні Магілёўскага аблвыканкама, каб той дапамог яму ў справе добраўпарадкавання крыніцы ў вёсцы Дубінка 1. Ён настойвае на будаўніцтве на тэрыторыі воднага аб'екта ліўневай каналізацыі, каб вада не размывала схіл, а таксама паркоўкі і кантэйнернай пляцоўкі. А паколькі гэтая зямля належыць фермерскай гаспадарцы «Пралесак», мужчына лічыць, што яе не перашкодзіла б забраць і перадаць у камунальную маёмасць або царкоўнай абшчыне. Маўляў, цяперашні гаспадар не спраўляецца са сваімі абавязкамі.

Анатоль Ісачанка даў эколагам даручэнне разабрацца ў пытанні ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Электрыфікацыя падворка і ўчастак пад сенакос

Гэтыя і іншыя пытанні ўзнялі жыхары Гомельскай вобласці на прыёме грамадзян, які правёў старшыня аблвыканкама Іван КРУПКО.

Адразу некалькі тэм закрануў жыхар пасёлка Забіяка Гомельскага раёна, паведамляе БелТА. Першая — наконт вывазу смецця ад прыватнага падворка. Па даручэнні губернатара санітарная служба пракантралюе гэты і іншыя маршруты вывазу смецця ў Гомельскім раёне: графік, якасць працы.

Другая тэма ад заяўніка — электрыфікацыя ўчастка, выдзеленага яму пад асабістую падсобную гаспадарку. Арыенціровачны кошт пытання — 45 тысяч рублёў. «Запрасіце энергетыкаў і разбярыцеся, якія ёсць тэхнічныя магчымасці, якія шляхі вырашэння», — даручыў раённым уладам губернатар.

Вясковец плануе таксама разводзіць жывёлу, а для гэтага яму патрэбны ўчастак пад сенакос і выпас. Для асабістай гаспадаркі ўчасткі могуць выдзяляцца толькі ў межах населенага пункта і толькі на свабодных плошчах, патлумачылі заяўніку. Варыянты вырашэння пытання прапрацуюць адпаведныя службы.

З праблемай уводу дома ў эксплуатацыю пасля рэканструкцыі звярнулася да губернатара гамяльчанка. Па словах гараджанкі, калі будынак рэканструявалі, аказалася, што тэхумовамі было прапісана ўзяць трубы вадавода (ён на балансе магілёўскага водаканала) у футляр, каб у выпадку парыву не падмыла дом, аднак у праекце гэта не знайшло адлюстравання. Жанчына падкрэсліла: зафутлярванне — справа вельмі дарагая, ды і суседзі згоды на раскопкі шматметровага катлавана не дадуць.

«Праблема ёсць. Трэба чалавеку дапамагчы. Дэталёва прааналізуйце сітуацыю, паглядзіце, як яе аптымальна вырашыць», — арыентаваў адказных кіраўнік вобласці.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Па сутнасці

Літары з душой

Цурчанне крыніцы ў летнюю спёку, храбусценне галля падчас шпацыру па баравікі пад ужо не гарачым, але яшчэ лагодным восенскім сонцам. Прыемны трэскат паленняў у цёплай бабулінай хаце. Гэта гукі шчасця. А яшчэ... Шмат чаго. Усе яны — такія моманты, калі па целе мурашкі, а на сэрцы хораша — могуць ажыць нават сярод вірлівага натоўпу ў метро альбо ў сучасным офісе на высокіх паверхах гарадской піраміды дасягненняў. Ажыць пад шэпт кніжных старонак. Хтосьці скажа: «Гэта кансерватыўны метад атрымання інфармацыі». Не, не кансерватыўны, а самы гарманічны, бо такая інфармацыя не кілабайты лічбаў і ўжо загадзя падрыхтаваныя факты і фэйкі — нібы аксіёмы. Яна не ператварае наш мозг у «флэшку», а калі што не так, то можна і адфарматаваць, бо такая інфармацыя для разваг, а не бяздумнага глытання. Лічбавая альбо кніжная. Канешне, усё залежыць ад самой «ежы» для інтэлекту: фаст-фуд альбо духмяны бохан хлебу.

Трэба разумець, што кніга — гэта не толькі развіццё тыпаграфічнай справы і занятасць інжынераў чалавечых душ. Гэта штосьці велічнае і сапраўднае. Элітарнае. Марыш быць шляхетным? Май стасункі з кнігамі, а не з гаджэтамі. Бо калі паглынаеш інфармацыю праз пошукавік, то здаецца, што гэта праца. А калі з кніжных паліц — адпачынак. Бо ў друкаваных літарах застаецца штосьці жывое і сапраўднае. Душэўнае. Дарэчы, і кнігі ў сівую даўніну друкавалі дзеля распаўсюджвання рэлігійных тэкстаў — маральных прынцыпаў.

А Свята беларускага пісьменства заўжды прываблівае сваёй адмысловай прастатой і душэўнай веліччу. Здаецца, нібы вялікая сямейная гутарка. Цікава атрымліваецца. Імёны ёсць, мастацкі шарм прысутнічае, а вось зайздрасці і напышлівасці не існуе. Чаму так? Бо сама беларуская мова прыгожая і сціплая. Нават цнатлівая. Як пяснярская прыгажуня Алеся ці купалаўская Алена.

Але мова не можа быць інструментам палітыкі. Каб зразумець, дастаткова паглядзець навіны з Данбаса. Усё пачыналася з моўнага пытання. І, дарэчы, моўная спадчына Купалы, Коласа і Багдановіча па стылістыцы лагодная і ласкавая, трапяткая. Няма ў нас характэрных «глухіх» зычных. Таму чулай беларускай мове непатрэбны крывавы і жорсткі мэйнстрым. Як у суседзяў. Нельга сілай навязваць моўную любоў.

Бо мова — не толькі сродак стасункаў, найперш — душа народа. Наша надта аздоблена дыялектамі. Багатымі і пявучымі. Працяглымі, як «беларуская Амазонка» — Прыпяць. Альбо звонкімі і радаснымі, як жыхары Віцебскага Паазер'я. А вось амаль акадэмічнае, спакойнае маўленне ў жыхароў павольнай Гарадзеншчыны.

Калі мова — ментальнасць, то пісьменства — знак дзяржаўнасці. Пісьмовыя крыніцы — нібыта невычэрпныя крыніцы геапалітычнай самадастатковасці. Калі некаторыя нашы суседзі палявалі адзін на аднаго, мы аркушамі, што выходзілі з-пад прэса друкарскага станка, кожнай новай літарай, кожным новым абзацам, кожнай старонкай уціскалі сябе ў сусветную гісторыю. І пра зубра, і пра залаты час. І калі «выкіпальны» кацёл нацый пачне казырыцца даўніной сваёй дэмакратыі, беларусам дастаткова адкрыць вокладку вядомага помніка юрыспрудэнцыі. Тое — сімвал нашай адукаванасці і дзяржаўнасці. Ёсць у нашай пісьменнасці штосьці няўлоўнае, але не менш важнае, чым літары закона. Тое — правілы, па якіх жыве чалавечнасць. Вы заўважылі, што няма на беларускай мове агідных «бестселераў». Якую старонку беларускай паэзіі ні адкрый — ляціць душа над роднымі шатамі, уздымаецца над аднатыпнымі лакацыямі глабалізацыі. Збярагчы сваю культуру, аўтэнтыку — значыць зберагчы ў гэтым стракатым свеце сябе, сваю Бацькаўшчыну, свой радавод. І сярод шматлікіх мультыкультурных іконак, сярод усяго гэтага лічбавага масмаркету мы працягваем выводзіць літары з душой.

Яўген ПУСТАВОЙ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Пуцін: «Мы нічога не пачыналі з пункту гледжання ваенных дзеянняў»

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін заявіў, што пасля пачатку ваеннай спецаперацыі ва Украіне Расія нічога не страціла, але ўмацавала свой суверэнітэт.

«Упэўнены, нічога мы не страцілі з пачаткам спецаперацыі ва Украіне і нічога не страцім. Галоўнае набыццё — гэта ўмацаванне нашага суверэнітэту і непазбежны вынік таго, што цяпер адбываецца», — сказаў расійскі лідар.

На яго думку, у адносінах да дзеянняў Расіі ва Украіне ёсць «пэўная палярызацыя», але яна «пойдзе толькі на карысць», бо РФ «адрыне» дзякуючы гэтаму «ўсё непатрэбнае, часовае» і што перашкаджае «ісці наперад».

Пуцін таксама лічыць, што Расія не пачынала ваенных дзеянняў ва Украіне.

«Мы нічога не пачалі з пункту гледжання ваенных дзеянняў, а спрабуем толькі скончыць. Пачалі ваенныя дзеянні ва Украіне пасля дзяржаўнага пераваротў ў 2014 годзе тыя, хто не хацеў нармальнага, мірнага развіцця і імкнуўся да прыгнечання ўласнага народа», — лічыць кіраўнік расійскай дзяржавы. Ён адзначыў, што Расія абавязана дапамагаць абараняцца ДНР і ЛНР, бо гэта замацавана ў дамовах з рэспублікамі.

Баявыя дзеянні ва Украіне ўваходзяць у крытычную фазу, заявіў генеральны сакратар НАТА Столтэнберг

Будучая зіма ўскладніць сітуацыю ва Украіне, а баявыя дзеянні ўваходзяць у крытычную фазу. Пра гэта напісаў генеральны сакратар НАТА Енс Столтэнберг у артыкуле для газеты The FInancial Times.

«Вайна ва Украіне ўваходзіць у крытычную фазу. Хутка зіма, і будзе цяжка — цяжка ўкраінскаму народу і ўзброеным сілам, якія змагаюцца за сваю свабоду; цяжка тым з нас, хто іх падтрымлівае», — напісаў генеральны сакратар Паўночнаатлантычнага альянсу.

Па словах Столтэнберга, «адзінства і салідарнасць» заходніх краін падвергнецца сур'ёзнаму выпрабаванню, паколькі жыхары і бізнес у хуткім часе адчуюць на сабе рэзкае павышэнне цэн на энерганосьбіты і кошту жыцця.

Раней СМІ паведамлялі, што па тэрміновым запыце міністра абароны Украіны Аляксея Рэзнікава Паўночнаатлантычны альянс заклікаў дзяржаў-членаў блока даць зімовы рыштунак Узброеным сілам Украіны.

Астраномы адкрылі землепадобную планету ў зоне, прыдатнай да жыцця, за 100 светлавых гадоў ад Зямлі

Астраномы аб'явілі аб адкрыцці дзвюх суперзямель у сістэме чырвонага карліка. Артыкул пра гэта апублікаваны ў Astronomy & Astrophysics.

Суперземлі — гэта камяністыя планеты, цяжэйшыя за Зямлю, але лягчэйшыя за Нептун. Паколькі ў іх ёсць цвёрдая паверхня, а гравітацыя здольная ўтрымаць атмасферу і ваду, яны лічацца перспектыўнымі з пункту гледжання выяўлення на іх жыцця.

Адкрытыя вучонымі з Бірмінгемскага ўніверсітэта планеты круцяцца вакол цьмянай і халоднай зоркі LP 890-9. Унутраная планета сістэмы прыкладна на 30 працэнтаў большая за Зямлю і здзяйсняе поўны абарот вакол свайго свяціла за 2,7 дня. Яе знайшлі транзітным метадам з дапамогай тэлескопа NASA TESS, назіраючы за ваганнямі яркасці зоркі, калі планета праходзіць па яе дыску.

Высветлілася, што яна знаходзіцца ў прыдатнай для жыцця зоне, гэта значыць, на ёй можа заставацца вадкая вада на працягу мільярдаў гадоў. Цяпер астраномы плануюць выкарыстоўваць найноўшы тэлескоп James Webb, каб высветліць, ці ёсць на гэтай планеце атмасфера і які яе склад.

Марафон «17 граняў адзінства»: першы прыпынак — Жлобін

«Белая Русь» ладзіць рэспубліканскі грамадска-палітычны марафон «17 граняў адзінства», прымеркаваны да Дня народнага адзінства.

Першым прыпынкам агульнарэспубліканскага праекта стаў Жлобін: дыялогавая пляцоўка аб'яднала членаў рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» пяці рэгіёнаў Гомельскай вобласці.

Удзельнікаў мерапрыемства вітаў **намеснік старшыні РГА «Белая Русь» Аляксандр АСТАПОВІЧ:**

— Для мяне складана аддзяліць «Белую Русь» ад патрыятызму ў цэлым. Нас ужо практычна 200 тысяч. Упэўнены, што пасля такіх сустрэч нас стане яшчэ больш. Перспектывы — на развіццё нашай дзяржавы. І, вядома, ёсць мэта стварэння палітычнай партыі. Гэтае пытанне сёння больш за ўсё хвалюе людзей. Адказваем: мы гатовыя і чакаем прыняцця нашымі заканадаўцамі адпаведнага дакумента.

Мадэратар сустрэчы, **намеснік старшыні Гомельскай абласной арганізацыі РГА «Белая Русь», Наталля МАМРУКОВА** паведаміла пра галоўную мэту праекта: даць магчымасць актывістам выказацца па найбольш значных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця краіны, прапанаваць свае шляхі іх вырашэння.

Удзельнікі абмеркавалі пытанні, якія датычыліся духоўных каштоўнасцяў і традыцый беларускага народа, патрыятычнага выхавання моладзі, партыйнага будаўніцтва на сучасным этапе развіцця грамадзянскай супольнасці краіны, удасканалення адносін Беларусі з Расійскай Федэрацыяй. Усе, хто выступіў на дыялогавай пляцоўцы, былі адзіныя ў тым, што духоўныя каштоўнасці і традыцыі нашага народа павінны быць нязменнымі і абапірацца на вопыт многіх пакаленняў, падкрэслілі ў «Белай Русі».

Нагадаем, што РГА «Белая Русь» ва ўзаемадзеянні з аб'яднаннем «Беларускае таварыства «Веды» рэалізоўвае буйны агульнарэспубліканскі праект — грамадска-палітычны марафон «17 граняў адзінства». З 6 да 15 верасня ў 17 рэгіёнах краіны пройдуць грамадска-палітычныя форумы. Актывісты выкажуцца па найбольш значных пытаннях парадку дня і прапануюць свае шляхі вырашэння вострых грамадскіх праблем. Марафон завершыцца падрыхтоўкай буйнога аналітычнага дакумента, у якім будзе адлюстравана меркаванне грамадзянскай супольнасці па гэтых тэмах.

Ксенія ДАБРАБЫТ.

Напярэдадні падзеі

На Піншчыне велапрабегам стартуе Тыдзень народнага адзінства

Маладзёжны велапрабег, прымеркаваны да Дня народнага адзінства, адбудзецца 10 верасня ўздоўж Дняпроўска-Бугскага канала ў Пінскім раёне, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў аддзеле ідэалагічнай работы і па справах моладзі райвыканкама.

Маршрут велапрабегу працягласцю 35 кіламетраў закальцаваны вакол знакавых аб'ектаў канала і праляжа праз вёскі Дамашыцы, Жытновічы, Ізін, Стаховічы. На шляху яго ўдзельнікаў сустрэнуцца дзве паромныя пераправы, рэліктавы дубовы лес і самыя маляўнічыя мясціны Пінскага раёна.

Дняпроўска-Бугскі канал — адна са славутасцяў Пінскага раёна. Пасля ўз'яднання Заходняй і Усходняй Беларусі, устанаўлення савецкай улады, у 1940 годзе была праведзена грандыёзная рэканструкцыя канала. Па ім пайшлі караваны судоў на Брэст, Мазыр, Гомель, Кіеў, сталі курсіраваць таварныя і пасажырскія параходы. Па сутнасці, рачным шляхам звязалі Піншчыну з Усходняй Беларуссю. Таму напярэдадні Дня народнага адзінства ўдзельнікі велапрабегу захацелі праехаць па знакавых мясцінах, аддаючы даніну памяці і павагі тым рабочым, якія аднаўлялі канал.

Мерапрыемства разлічана ў асноўным на моладзь. Але ў ім могуць прыняць удзел усе ахвотныя — аматары актыўнага адпачынку, у тым ліку з іншых раёнаў. Велапрабег не мае спартыўных мэт, а носіць больш экскурсійна-пазнавальны характар і накіраваны на павышэнне турыстычнай прывабнасці рэгіёна.

З велапрабегу ў Пінскім раёне стартуе Тыдзень народнага адзінства, падчас якога таксама запланаваны маладзёжны форум, аўтапрабег, выставы і іншыя мерапрыемствы.

Класныя навіны

МАШЭРАЎСКІЯ ЛІЦЭІСТЫ

Свята першага званка найлепшыя дзесяцікласнікі Віцебшчыны сустрэлі не за звыклымі школьнымі партамі, а ў новаадкрытым ліцэі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Пятра Міронавіча Машэрава. Установа стала важнай ступенню ў замкнутым адукацыйным цыкле ВНУ.

Па словах **рэктара ВДУ Валянціны БАГАТЫРОВАЙ,** у яго структуры адладжана працуюць каледжы, рыхтуюць спецыялістаў на першай ступені адукацыі, у магістратуры, больш чым па 30 праграмах аспірантуры. Адкрыты дзве праграмы дактарантуры, функцыянуюць саветы па абароне дысертацый, а адкрыццё ліцэя стала ключавым механізмам у няспынным замкнутым адукацыйным цыкле.

Гонару быць першымі машэраўскімі ліцэістамі былі ўдастоены 72 школьнікі Віцебшчыны, якія вытрымалі нялёгкія ўступныя экзамены: конкурс у новую ўстанову адукацыі склаў амаль два чалавекі на месца. Навучанне арганізавана па трох профілях: фізіка-матэматычны, хімія-біялагічны і гуманітарны — па 24 чалавекі на кожным.

Для адпаведнасці ведаў, уменняў і навыкаў школьнікаў патрабаванням сучаснага грамадства ў навучальным працэсе па фізіка-матэматычным профілі выкарыстоўваюцца сучасныя інавацыйныя тэхналогіі (IKT, тэхналогіі QR-кодаў, тэхналогіі 3D-мадэлявання і 3D-друку, імерсіўныя тэхналогіі: VR, AR, MR), а таксама тэхнічнае абсталяванне (лабараторыя Apple на базе камп'ютараў Macmini з аперацыйнай сістэмай MacOS; лабараторыя манаблокаў з сэнсарнымі экранамі, лабараторыі, створаныя з вядучымі IT-кампаніямі (EPAM Systems, iTechArt, LACIT Innowise Group).

Навучанне па хіміка-біялагічным профілі арганізавана з выкарыстаннем сучасных лічбавых інструментаў і STEM-тэхналогій, уключаючы віртуальную і дапоўненую рэальнасці. Навучальныя заняткі праходзяць у лабараторыях, аснашчаных сучасным абсталяваннем для ўсіх відаў фізіка-хімічнага і біялагічнага аналізаў: спектраскапічнага, электрахімічнага, храматаграфічнага, гістахімічнага і мікраскапічнага.

У гуманітарным кірунку акцэнт зроблены на адукацыйны працэс з выкарыстаннем праектных, кластарных, сацыякультурных тэхналогій у адпаведнасці з інтэграцыяй гуманітарных ведаў з сумежнымі дысцыплінамі.

«Ліцэй — гэта важны інструмент для з'яўлення ў ВНУ Віцебскага рэгіёна асабліва матываваных абітурыентаў, у якіх ёсць магчымасць не толькі атрымліваць веды ад вядомых навукоўцаў-педагогаў і паглыбляцца на ранніх стадыях у навукова-даследчую працу, выкарыстоўваючы патэнцыял сучасных лабараторый, але і стаць часткай дружнай універсітэцкай сям'і, у якой такія паняцці, як гонар, сумленне, годнасць, любоў да Радзімы, займаюць асабліва месца», — падкрэсліла рэктар.

Установа адукацыі для дзесяцікласнікаў размяшчаецца на базе вучэбнага корпуса № 4 па суседстве з мастацка-графічным факультэтам. У непасрэднай блізкасці ад яе — адрамантаваны інтэрнат для навучэнцаў з аддаленых месцаў, у якім створаны ўсе ўмовы для камфортнага пражывання.

У арганізацыі асноўнага адукацыйнага працэсу задзейнічаны 29 педагогаў, для ліцэістаў адкрыты ўсе ўніверсітэцкія творчыя і навуковыя суполкі, што дазваляе дзяўчатам і хлопцам знаёміцца з актыўным студэнцкім рухам і абірацца для сябе спецыяльнасці для атрымання вышэйшай адукацыі.

Для Данііла Міхайлава з Новалукомля паступленне ў ліцэй — вялікі крок на шляху да будучай прафесіі медыка. Юнак абраў хіміка-біялагічны профіль, а яшчэ ён займаецца біятлонам і плануе адстойваць гонар ліцэя на спартыўных спаборніцтвах. А віцэбчанін Вадзім Фёдараў залічаны на фізіка-матэматычны кірунак, хлопец плануе стаць інжынерам-праграмістам і атрымаць адукацыю ў ВДУ. На гэтым напрамку вылучаецца Міраслава Ладуцька, яна захапляецца матэматыкай і плануе звязаць жыццё з праграмаваннем.

Свае віншаванні ліцэістам і кіраўніцтву ўніверсітэта даслалі намеснік міністра адукацыі Аляксандр Кадлубай і старшыня аблвыканкама Аляксандр Субоцін, які адзначыў, што для маладзёжнай сталіцы Беларусі адкрыццё ліцэя ВДУ імя П. М. Машэрава — знаковая падзея.

Сёння ў распараджэнні навучэнцаў — камп'ютарныя класы, навукова-даследчыя і спецыялізаваныя навучальныя лабараторыі, цэнтры замежных моў, сістэма кіравання навучаннем, рэпазітар, найбуйнейшая навуковая бібліятэка. Гэта дазволіць пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў падрыхтаваць з поўных энтузіязму школьнікаў матываваных абітурыентаў, будучых вучоных, інжынераў, урачоў, настаўнікаў, аграрыяў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота БелТА.

Гонару быць першымі машэраўскімі ліцэістамі былі ўдастоены 72 школьнікі Віцебшчыны, якія вытрымалі нялёгкія ўступныя экзамены: конкурс у новую ўстанову адукацыі склаў амаль два чалавекі на месца.



ЛЕСВІЦА З ПРАЦЯГАМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Працавалі 76 дзён, з 14 мая да 28 ліпеня, — рапартуе педантычны актывіст. — Памятаеце, што прыступкі былі дзесьці вышэй, дзесьці ніжэй? Зараз усе роўненькія. Заходзіў днямі ва ўпраўленне камунальных прадпрыемстваў, цікавіўся: ці прынялі лесвіцу? Кажуць, пакуль не. Нагадаў, што прымаць будзем толькі разам з Тэхнаглядам.

Першай справай на месцы апытваем народ: ці задаволены, ці зручна, можа, нешта перашкаджае?

Вось ідзе жанчына з дзецьмі. На пытанне, ці стала лесвіца лепшай, адказвае: адназначна.

— Зімой я на ёй ледзь не забілася, — прызнаецца жанчына. — Але тады яна была ў дрэнным стане. Зараз — іншая справа.

Юрый, які жыве на Падгорнай, лесвіцай карыстаецца пастаянна. Сціпла кажа, што стала значна лепш.

— Зімой звычайна побач з лесвіцай спускаўся, зараз, спадзяюся, не давядзецца так рабіць, — дадае ён.

У краме «Марыя», якая знаходзіцца непадалёк, таксама абмяркоўваюць перамены. Пакупніца Зінаіда ўспамінае, як некалькі гадоў таму ранняй вясной яна на лесвіцы паслізнулася, нагу падвярнула і паехала ўніз. У выніку — пералом. Месяц на бальнічным сядзела. Трэба было б тады паскардзіцца, каб меры прынялі. Але не да таго было. Потым надзвычайная сітуацыя забылася. Хоць траўма з узростам усё больш дае знаць пра сябе. Бывае, нагу так круціць, што хоць каравул крычы.

— А колькі такіх выпадкаў было, не злічыць, — дадае Аляксандр Пікуля.

— Якой была лесвіца і якой стала — неба і зямля, — кажуць прадавачкі. — Але паглядзім, як яна сябе пакажа зімой. Ці будуць ледзянець прыступкі і абломвацца ад марозу. Вось тады і даведаемся, які там раствор паклалі.

Аляксандр Пікуля расказвае, што кантраляваў працэс увесь час. Асабліва шмат было праблем з ніжняй пляцоўкай. Спачатку яе не давялі да ладу, пакінулі так. Яшчэ і кавалак арматуры тырчаў з прыступкі. Стараста пачакаў крыху, пакуль нехта пра недаробкі ўспомніць, а калі зразумеў, што бессэнсоўна, пачаў шукаць канцы. Патэлефанаваў у адміністрацыю раёна, маўляў, чаму работы прыпыніліся? А там адказваюць, што яны наогул скончаны. Мужчына зноў сеў на тэлефон. І ўсё ж такі дабіўся, каб работу давялі да лагічнага завяршэння. Дашліфоўвала аб'ект зусім іншая брыгада аднаго з камунальных прадпрыемстваў. Відаць, што будаўнікі стараліся. Нават пераход плаўны ад лесвіцы да сцяжынкі зрабілі. Атрымалася даволі прыгожа і зручна.

Свае падзякі стараста адрасуе «Звяздзе», маўляў перамены адбыліся з падачы газеты. Пра гэта ён не забываўся паведаміць кожнаму сустрэчнаму і сказаць, што карэспандэнт «Звязды» побач з ім. Каб разумелі, каму дзякаваць. Людзі казалі добрыя словы, а разам з імі прасілі дапамагчы з добраўпарадкаваннем іншых лесвіц і стыхійных сцяжынак, якія яны называюць дарогамі жыцця, бо гэта прамая сувязь з горадам.

Сапраўды, у леташнім матэрыяле мы казалі яшчэ пра адну дарогу, дакладней, народную сцяжынку, якая знаходзіцца непадалёк ад адрамантаванай лесвіцы. Яна цягнецца ўздоўж водапрыёмніка. Асабліва часта гэтым шляхам карыстаюцца маладыя маці з каляскамі, бо па лесвіцы з такім грузам не падняцца. Жыхары Падгорнай просяць, каб яе добраўпарадкавалі, але гарадскія ўлады не пагаджаюцца, маўляў, вельмі вузкая. Між тым праблема сапраўды існуе. Пакуль мы з Пікулем «прымалі» лесвіцу і цікавіліся меркаваннем людзей, па сцяжынцы прайшло яшчэ больш народу, чым па лесвіцы.

— За гэтую сцяжынку восем гадоў ідзе вайна, — кажа Аляксандр Пікуля. — З лесвіцай, спадзяюся, разабраліся, зараз трэба тут наводзіць парадак. Як людзям з каляскамі падымацца? Пандуса няма, сцяжынку падчас моцных дажджоў размывае — проста бяда. Дзякуй дырэктару крамы «Марыя», які рабіў у памяшканні рамонт і крыху падсыпаў буту на сцяжынку. Але было б добра ўсю яе забетанаваць.

Адна з прадаўшчыц крамы «Марыя» расказала, што бегла па ёй пасля работы на прыпынак і зачапілася за арматуру, якая тырчала з травы. «Ледзь не забілася, — скардзіцца жанчына. — Што перашкаджае добраўпарадкаваць праход? Ніхто не патрабуе вялікіх укладанняў, дастаткова навесці парадак».

Акрамя гэтага, у краме параілі звярнуць увагу на лесвіцу па другі бок моста. Маўляў, таксама абсыпаецца. І хаця гэта ўжо тэрыторыя не Пікулі, ён пагаджаецца паказаць гэты шлях.

— Там рамонт больш чым 20 гадоў не рабілі, — з веданнем справы кажа ён. — Першапачаткова добрая лесвіца была, якасная, але ж няма нічога вечнага.

Магчыма, для кагосьці гэта дробязі, але для людзей, якія жывуць у даволі цяжкадаступнай зоне, проста бяда. І размова ідзе не пра дзве-тры сям'і. Усяго на Падгорнай 830 дамоў.

Яшчэ больш уразіла, як людзі штурмуюць круты схіл, каб падняцца з прыпынку грамадскага транспарту «Падгорная» наверх да цывілізацыі — у мікрараён Юбілейны.

Па ідэі, павінна быць лесвіца. Яна і ёсць, але збоку. Каб да яе дабрацца, трэба перайсці самаробны масток праз цеплатрасу, па сцяжынцы дайсці да яе і пералезці цераз парэнчы. Але шмат хто ігнаруе гэты мудрагелісты шлях і падымаецца адразу па схіле. У сувязі з гэтым тут утварылася цэлая сетка рознакаліберных сцяжынак. Кожны пратаптаў там, дзе яму зручна. Прыйшлося нават пабачыць, як усё гэта функцыянуе. Якраз падышоў аўтобус, і з дзясятак чалавек гуськом сталі падымацца наверх.

— Вось так людзі ў нас караскаюцца па гарах з работы і на работу, — разводзіць рукамі Пікуля. — Што рабіць — такі горны ў нас раён. У раёне восем лесвіц: дзве жалезабетонныя, тры металічная і тры драўляныя. І гэта не ўлічваючы розных там сцяжынак. З апошнімі ўсё зразумела, але ж трэба стацыянарныя лесвіцы даглядаць. Навошта нас увесь час прымушаюць нагадваць уладам пра гэта?

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

Каб помнілі

З ІМЕНЕМ ФІНБЕРГА

Аркестр, якім кіраваў маэстра, будзе насіць яго імя

Народнага артыста Беларусі, дырыжора Міхаіла Фінберга не стала напрыканцы мінулага года. Засталася справа — вялікая, адзіна важная, якой ён прысвяціў усё сваё жыццё: аркестр. Канцэртны аркестр Беларусі быў не толькі яго справай — наогул сэнсам жыцця, нават сям'ёй. А сям'я звычайна мае імя, якое яднае розныя яе адгалінаванні.

...Цяжка было ўявіць у 1987 годзе, у што выльецца пачатак працы Міхаіла Фінберга з канцэртным аркестрам — што дзякуючы імпэту яго кіраўніка Беларусь атрымае безліч яркіх канцэртных праграм на творы выдатных беларускіх паэтаў і кампазітараў. Гэта былі сапраўдныя культурныя падзеі, калі былі ўзняты пласты песень, створаных на словы Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча, Петруся Броўкі ды сучасных паэтаў. Нібыта песні і былі на слыху, пра іх ведалі, але калі яны аб'ядналіся ў асобнай праграме, то гучалі асабліва ўрачыста, а слухачы былі ўражаны адкрыццём: наша, беларускае слова, самае мілагучнае і прыгожае. Фінберг усміхаўся, і час ад часу сам падаваў прыклад, як трэба гаварыць па-беларуску. Ён смакаваў асобныя словы так, як гэта можа рабіць музыкант: стараўся падбіраць такія, каб чалавек задумаўся: а што гэта значыць? І калі Фінберг так можа гаварыць, то чаму я не магу? Ён натхняў сваім прыкладам.

І тады натхняў, калі адзін за адным у Беларусі сталі ўзнікаць фестывалі, заснавальнікам якіх стаў Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі. Спачатку быў магутны рух, якім у нейкі момант стаў фестываль нацыянальнай песні і паэзіі ў Маладзечне, для якога ствараліся адмысловыя праграмы. А потым дырыжор пайшоў далей, зразумеўшы, што сучаснасць немагчымая без гісторыі. І зноў зрабіў неверагоднае, фактычна ахінуўшы Беларусь сеткай фестываляў камернай музыкі, на якіх уздымаліся старадаўнія творы, бо музыка ў Беларусі не пачалася з 1917 года. Разам з навуковым кіраўніком фестывалю прафесарам Вольгай Дадзіёмавай яны паказалі: у Нясвіжы, Міры, Мсціславе, Заслаўі і іншых гарадах людзі гатовыя слухаць сур'ёзную беларускую музыку, адкрываць для сябе імёны Яна Голанда, Антонія Радзівіла, Восіпа Казлоўскага і тых музыкантаў, імёны якіх зацерушыліся праз стагоддзі і эпохі. А музыканты яго аркестра даказвалі: яны здольныя іграць не толькі эстрадныя творы, але і вельмі віртуозныя музычныя сачыненні. За што і атрымлівалі высокія адзнакі: званне заслужанага калектыву і пазней нацыянальнага. Здавалася, што якую б ідэю ні прапанаваў няўрымслівы Міхаіл Якаўлевіч, яны здолеюць яе ажыццявіць разам з гэтым аркестрам. З яго аркестрам, за які маэстра заўсёды стаяў гарой, пра ўзровень і імідж якога так моцна клапаціўся, бо ведаў: «нацыянальны» — высокае званне, увесь час трэба даказваць, што яму адпавядаеш. Цяпер народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг са сваім аркестрам назаўсёды. І ўсё так жа вызначае яго імідж.

Ларыса ЦІМОШЫК.

ООО «Юридическая компания Аспект» проводит первые повторные торги в форме открытого аукциона по продаже имущества ликвидируемого юридического лица – ООО «РЕТРОМАРКЕТ»

№ лотов	Наименование лота	Количество единиц, входящих в состав лота	Начальная цена за лот без учета НДС, руб.	Шаг торгов (5 %), руб.	Задаток для участия в торгах (10 %), руб.
1–69	**Перечень лотов размещен на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»**				
*Торги назначены на **19.09.2022 г. в 10.30** по адресу: **г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4-й этаж).** Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до **16.09.2022 г.** включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*					
Продавец	**ООО «РЕТРОМАРКЕТ»**				
Организатор торгов	**ООО «Юридическая компания Аспект»**				
Реквизиты для оплаты задатка	**Бенефициар – ООО «РЕТРОМАРКЕТ», р/с BY17OLMP30120000887110000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, г. Минск, УНП 192512680**				

Условия торгов

• К участию в торгах допускаются лица, заключившие с организатором торгов договор о задатке, внесшие денежный задаток, представившие организатору торгов в установленный срок заявление на участие в торгах с приложением всех необходимых документов и зарегистрированные в соответствующем журнале;

• лицо, желающее участвовать в торгах, представляет с заявлением копию платежного документа с отметкой банка об исполнении, подтверждающего внесение задатка на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА. При личном обращении заявитель (представитель) предъявляет оригинал документа, удостоверяющего личность. Дополнительно организатору торгов представляются:

- юридическом лицом: копия последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность на представителя (если юридическое лицо представляет не руководитель) или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица;

- юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом Республики Беларусь): копии учредительных документов вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выданной не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, доверенность на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;

- ИП: копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

- представителем гражданина Республики Беларусь, ИП: нотариально удостоверенная доверенность;

- представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь): легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

• победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;

• договор купли-продажи подлежит подписанию в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретаемый предмет торгов (лот);

• в случае если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов (лот) продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов;

• победитель/единственный участник торгов, выразивший согласие на покупку предмета торгов (лота) по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов, оплачивает стоимость предмета торгов (лота) **с учетом НДС 20 %,** за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 5 (пяти) календарных дней со дня подписания договора купли-продажи; иной срок для оплаты предмета торгов (лота) может быть определен соглашением сторон.

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в номере газеты «Звязда» за 05.07.2022 г. (стр. 6)

Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8 (017) 3480699 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30).

Ознакомиться с предметом торгов возможно по месту нахождения имущества, после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627.

Пустыя паліцы, гіперінфляцыя і «блэкаўт-чамаданчыкі»

У Польшчы з-за высокіх цэн на газ ужо ў найбліжэйшы час можа ўзнікнуць харчовы крызіс, адзначыла газета Wiadomosci. Раней польскі паліўны канцэрн ORLEN спрагназаваў трохразовае павышэнне цаны прыроднага газу па выніках 2022 года. Таксама канцэрн чакае значнага павелічэння кошту электраэнергіі. Wiadomosci звярнула ўвагу на тое, што з-за падаражання вуглевадародаў у краіне закрыліся або скарацілі вытворчасць шэраг прадпрыемстваў, звязаных з харчовай прамысловасцю. У прыватнасці, у кампаніі Grupa Azoty абвясцілі аб закрыцці прадпрыемства па вытворчасці ўгнаенняў і кампанентаў стварэння пластмасы, а хімічныя заводы, якія ўваходзяць у групу Capital, заўважна знізілі аб'ём вытворчасці аміяку. Як вынік, у харчовай прамысловасці пачаўся дэфіцыт неабходных для вытворчасці тавараў, такіх як вуглякіслы газ. У выніку з паліц крам усяго праз два-тры тыдні могуць знікнуць мяса, малочныя прадукты і іншыя тавары, рэзюмуе Wiadomosci. І гэта толькі адна з праяў сістэмнага крызісу, які накрывае суседнюю краіну. Што ж чакае палякаў?

ПЯТЛЯ НА ШЫІ

У Польшчы цэны на газ для прадпрыемстваў плануюць узняць у 12—15 разоў. Гэта прывядзе да таго, што сотні польскіх заводаў будуць вымушаныя закрыцца ў студзені 2023 года. Пра гэта заявіў экс-прэм'ер Польшчы, лідар партыі «Грамадзянская платформа» Дональд Туск, паведаміла польская газета Dziennik Gazeta Prawna. Апазіцыйны палітык сустрэўся з кіраўніцтвам і працоўнымі тэкстыльнай фабрыкі ў горадзе Канстанцінаў-Лодзькі.

Уладальнік фабрыкі Каміл Білінскі распавёў аб адчайным становішчы прадпрыемства з-за росту цэн на газ. Ён растлумачыў, што пасля заканчэння дагавора на пастаўку газу цана на паліва за мегават-гадзіну ўзрасце з 88 злотых да 1300—1600 злотых. Аб маючым адбыцца росце тарыфаў ужо папярэдзіла дзяржаўная нафтагазавая кампанія Польшчы PGNiG. «Гаворка ідзе аб тым, што будзе прымяняцца да нас з 1 студзеня 2023 года. Тады адзін рахунак ад PGNiG будзе перавышаць абарот нашай кампаніі. Зараз мы плацім за газ ад 800 тысяч да 1 мільёна злотых у месяц. Паводле новых тарыфаў, гэта будзе 12—15 мільёнаў злотых. Тады вытворчасць на заводзе будзе нерэнтабельнай», — прызнаў ён.

У сваю чаргу Туск адзначыў, што ўжо сёння PGNiG і польскі ўрад прапануюць прадпрымальнікам цэны на газ у 2,5-3 разы вышэйшыя, чым у Германіі, Францыі, Іспаніі або Партугаліі. Падобны стан спраў ён назваў драматычным і заявіў, што пятля на шыі польскіх прадпрыемстваў усё больш зацягваецца. «Тое, што адбываецца ў апошнія тыдні, выходзіць за рамкі ўяўлення... Прапановы PGNiG азначаюць дванаццаціразовы, чатырнаццаціразовы, пятнаццаціразовы рост. Не на 15 працэнтаў, а на 1000 працэнтаў, 1200 працэнтаў, 1300 працэнтаў», — заўважыў лідар «Грамадзянскай платформы». Паводле яго слоў, у цяжкім становішчы аказаліся не толькі прадпрыемствы тэкстыльнай галіны.

Па ўсёй краіне заводы б'юць трывогу ў сувязі з будучым павышэннем цэн на газ. Падобная сітуацыя прывядзе да таго, што прадпрымальнікі пачнуць згортваць свой бізнес, заводы спыняцца, а тысячы чалавек апынуцца на вуліцы. «Гэтая пятля зацягваецца настолькі туга, што ў студзені, у лютым упадуць дзясяткі, а можа быць, і сотні найлепшых польскіх заводаў. І гэта закране не толькі польскіх прадпрымальнікаў, але і супрацоўнікаў гэтых кампаній», — падкрэсліў Туск.

Уладальнік лодзінскай кампаніі тэкстыльнай прамысловасці Marko-Kolor Стэфан Дзерандоўскі, які прысутнічаў на сустрэчы, заявіў, што, калі ўрад нічога не зробіць з цэнамі на газ, ён будзе вымушаны закрыць свой завод, дзе працуюць 200 чалавек. «Кажу гэта на эмоцыях, таму што сутыкнуўся з сур'ёзным крызісам у нашай кампаніі. Думаю, што гавару ад імя тысяч падобных заводаў... Сёння я расходую ўласныя зберажэнні на вытворчасць. Сітуацыя драматычная», — адзначыў Стэфан Дзерандоўскі. У адказ Туск заявіў, што калі ўрад Польшчы не перастане займацца толькі палітычнымі пытаннямі, праз год у краіне нічога не застанецца.

БЕЗ ШАНЦАЎ

Рост цэн на электраэнергію напалохаў польскія ўлады, паведаміла Interia.pl. Яны ідуць на беспрэцэдэнтныя меры і заклікаюць да жорсткай эканоміі. З-за росту цэн на энерганосьбіты мясцовыя ўлады не на жарт спалоханыя. Рост цэн дасягае ажно 700 працэнтаў, так што гэта, безумоўна, адбіваецца на жыхарах. Ужо зараз вядуцца размовы аб тым, што можа спатрэбіцца закрыццё офісаў, басейнаў або каткоў, адключэнне ілюмінацыі і гарадскога асвятлення, арганізацыя пунктаў абаграванння для жыхароў. Чакаецца, што ў офісах, якія не будуць закрытыя, тэмпература складзе 18 градусаў па Цэльсію, адзначыла Interia.pl.

Ужо вядома, што з пачатку наступнага года цэны на энерганосьбіты для мясцовых улад узляцяць. Толькі ў выпадку Цэханава разнкі за вулічнае асвятленне і энергію для будынкаў і гарадскіх аб'ектаў узраслі на восем мільёнаў злотых (каля 1,7 млн долараў). «Мы абавязкова ўвядзём абмежаванні. Напрыклад, у дачыненні да вулічнага асвятлення: магчыма, будзем выключаць яго ноччу. Змены таксама могуць закрануць каткі і басейны», — падкрэсліў кіраўнік горада Цэханаў Кшыштаф Касіньскі. Аб неабходнасці зацягнуць паясы выказаўся і мэр Хелмы Якуб Банашак.

Лідарам у эканоміі з-за энергетычнага крызісу аказваецца Валбжых. На сесіі гарсавета ўвесь пакет мерапрыемстваў абвясціў кіраўнік горада Раман Шалямей. «Мы адмаўляемся ад асвятлення калідораў і агульных прастор, у офісных памяшканнях будзе тэмпература да 18 градусаў па Цэльсію, — кажа чыноўнік. — На перыяд восеньска-зімовага сезона мы таксама аб'ядноўваем розныя аддзелы гарадскіх устаноў. Некаторыя з асобных аб'ектаў будуць ацяпляцца толькі ў той меры, у якой гэта неабходна для функцыянавання інфраструктуры».

Падчас ацяпляльнага сезона Валбжых не зможа выкарыстоўваць адзін з басейнаў. «Мы таксама ўводзім надзвычай строгія рэкамендацыі ў дачыненні да дырэктараў і кіраўнікоў устаноў, якія датычацца адключэння электраэнергіі, выкарыстання розных прылад у непрацоўны час, — заяўляе Шалямей. — З 20.00 мы выключаем асвятленне гістарычных аб'ектаў, ілюмінацыі, вітрыны».

У горадзе будзе створана 26 пунктаў абаграванння. Адпаведныя пункты з'явяцца ў бібліятэках, тэатрах, у старой шахце, канферэнц-залах, дамах і клубах для пажылых людзей, адукацыйных установах. Абагравание гэта мала што мяняе. Летась у нас быў рахунак у памеры 219 тысяч злотых, зараз — 1,5 мільёна злотых. Гэта нейкая драма, што нам з гэтым рабіць?» — заломвае рукі кіраўнік горада.

Паводле даных польскага Нацыянальнага рэестра даўгоў (KRD), на канец першага паўгоддзя ў польскіх кампаній назапасілася запазычанасць 9,18 мільярда злотых. Рэкорд адзначаны ў горадзе Катавіцы: ён належыць жыллёваму каапэратыву, члены якога павінны 24,7 мільёна злотых за ацяпленне. Паводле ацэнкі кіраўніка бюро эканамічнай інфармацыі Нацыянальнага рэестра даўгоў Адама Лонцкага, у кампаній, якія «перагружаны вялізнымі даўгамі ў мільёны, мала шанцаў выйсці на прамую дарогу».

НЕ ПА КІШЭНІ

Хоць Польшча з'яўляецца буйным вытворцам вугалю, большая яго частка мае нізкую якасць і выкарыстоўваецца ў асноўным на электрастанцыях. Менавіта Расія пастаўляла значную частку паліва, якое выкарыстоўваецца польскімі хатнімі гаспадаркамі. З-за ўзніклага дэфіцыту Варшава спрабуе знайсці замену расійскім пастаўкам (якія сама ж забараніла) у далёкіх вытворцаў, такіх як Калумбія і Паўднёвая Афрыка. Адпаведна, кошт вугалю ў Польшчы ўжо павялічыўся ўтрая — з менш чым 1000 злотых за тону ў мінулым годзе да больш за 3000 злотых за тону цяпер.

Спецыялісты ставяць пад сумненне заяву прэм'ер-міністра Польшчы Матэвуша Маравецкага аб тым, што палякам не трэба апасацца гэтай зімы. «Становішча польскіх хатніх гаспадарак зімой будзе вельмі моцна залежаць ад надвор'я, што выклікае неспакой», — заўважыла Financial Times Ілона Эндрасік з польскага офіса экалагічнай няўрадавай арганізацыі ClientEarth. З-за росту цэн хатнія гаспадаркі будуць вымушаны перайсці з вугалю на таннейшыя драўняныя брыкеты ці нават пачаць паліць смецце, каб абагравать дамы. «У гэтым годзе якасць паветра будзе нашмат горшая з-за таго, што людзі пачнуць паліць шмат смецця, каб сэканоміць», — заўважыў прэзідэнт Гандлёва-прамысловай палаты польскіх прадаўцоў вугалю Лукаш Горбач.

Польскія эксперты не выключаюць рызыкі агульнанацыянальнага адключэння электрычнасці, адзначыла Wirtualna Polska. Намеснік галоўнага рэдактара партала Energetyka24.com Якуб Вех песімістычна пракаментаваў энергетычную сітуацыю ў краіне. «Адным з недахопаў польскай энергасістэмы з'яўляецца дэфіцыт устаноўленых магутнасцяў. У нас недастатковая вытворчых адзінак для нашых патрэб. Мы ўбачылі гэта ў снежні 2021 года, калі ў польскага аператара ўзніклі праблемы з камплектаваннем сістэмнага рэзерву», — сказаў эксперт. Тады стабільнасць сістэмы ўдалося забяспечыць толькі пры падтрымцы суседніх краін. На думку эксперта, гэта паказвае на абуральны дэфіцыт устаноўленых у Польшчы магутнасцяў. Калі ў гэтым пытанні не будуць прыняты адпаведныя меры, энергетычная бяспека Польшчы акажацца пад вялікім пытаннем. Сярэдні ўзрост вытворчых адзінак энергетыкі ў краіне складае 47 гадоў, а 71 блок ужо перавысіў тэрмін службы, на які яны былі разлічаны.

Якуб Вех адзначыў, што гэтай зімой магчымыя перабоі ў падачы электраэнергіі. У першую чаргу ад сеткі могуць быць адключаны прамысловыя карыстальнікі. Блэкаўт пагражае і жыхарам, таму Якуб Вех параіў палякам загадзя сабраць так званы «блэкаўт-чамаданчык». Гэта можа быць шафка ці скрынка, у якой варта прыгатаваць набор прылад і аксесуараў, якія дазваляюць спакойна перажыць перыяд без электрычнасці. Там павінна знаходзіцца некалькі асноўных рэчаў: ліхтарык, аптэчка, акумулятар, тэрмакоўдра, запальнічка, запалкі. Захоўванне такога набору ў лёгкадаступным месцы дапаможа перажыць некалькі гадзін ці нават дзён у выпадку працяглага адключэння электраэнергіі.

Тым часам стала вядома, што варшаўскі рынак «Алімпія» зноў карыстаецца папулярнасцю ў мясцовага насельніцтва. Кірмаш грымеў у 1990-я, калі «незалежная Польшча» жабравала. Цяпер кола гісторыі, па ўсёй верагоднасці, зрабіла абарот. Газета Wyborcza піша, што на «Алімпіі» паўсюль устаноўлены імправізаваныя шапікі, а некаторыя гандляры раскладваюць свае тавары на посцілках на зямлі або на складных століках. Асартымент, як выказаўся журналіст Войцэх Карпечук, — «пратэрмінаваныя прадукты, падгнілая гародніна, падазронае мяса, падробленыя духі і цыгарэты без акцызаў», але гэта менавіта тое, што могуць дазволіць сабе купіць польскія пенсіянеры, заўважае Wyborcza. «Тут нашмат танней, але трэба глядзець на даты, таму што тэрмін прыдатнасці многіх прадуктаў ужо скончыўся», — расказвае 77-гадовая пані Барбара, якая пасля 37 гадоў працы мае пенсію ў 1600 злотых (каля 330 долараў), але вельмі шмат з'ядае камуналка. І на жыццё амаль не застаецца.

Перспектывы зусім не аптымістычныя. Паказчык гадавой інфляцыі ў Польшчы ў жніўні дасягнуў 16,1 працэнта. Гэта найвышэйшы ўзровень з 1997 года, паведаміў інфармацыйны партал польскага радыё RMF 24 са спасылкай на даныя Галоўнага статыстычнага ўпраўлення краіны. Адзначаецца, што цэны на прадукты харчавання ў Польшчы ўзраслі на 17,4 працэнта ў гадавым вылічэнні, на энергію — на 40,3 працэнта, на паліва — на 23,3 працэнта. Аналітыкі прагназуюць, што прадпрыемствы прадоўжаць павышаць цэны на сваю прадукцыю з-за росту кошту электраэнергіі. Таксама значна павялічацца рахункі за ацяпленне.

Пётр ДУНЬКО.

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Кап. строение с инв. № 631/С-66692 (назначение – Здание специализированное автомобильного транспорта; наименование – здание крытой стоянки, общая площадь – 1 476,5 кв. м)	117 720,00	11 772,00	5 886,00
2	Станок точ. шлиф, инв. № 62-О	109,80	10,98	5,49
3	Станок хонинговальный 3г 883, инв. № 692	342,00	34,20	17,10
4	Станок 3к633 обд-шлиф., инв. № 716	145,80	14,58	7,29
5	Станок СФУ 46810 шил, инв. № 625	323,40	32,34	16,17
6	Станок расточный шил, инв. № 693	1218,00	121,80	60,90
7	Станок обдирочно-шлифовальный дт-2 ш, инв. № 700	630,00	63,00	31,50
8	Станок мк184-5 свер. шил, инв. № 719	714,00	71,40	35,70
9	Фреза почв дмр-4000, инв. № 1326	4872,00	487,20	243,60
10	Сеялка пневм.мт-6f, инв. № 1327	4998,00	499,80	249,90
11	Фреза почв дмр-4000, инв. № 1333	4872,00	487,20	243,60
12	Доил устан 2адсн, инв. № 3051А	2142,00	214,20	107,10
13	Весы вш-2001 (1), инв. № 306аТ	42,00	4,20	2,10
14	Весы вш-2001 (2), инв. № 3066Т	42,00	4,20	2,10
15	Весы вш 2001 (3), инв. № 306вТ	42,00	4,20	2,10
16	Водонаг вгк-70 осип, инв. № 440А	14,28	1,43	0,71
17	Электросирена с-40, инв. № 6003	113,40	11,34	5,67
18	Водораздатчик ву-3а, инв. № 659Т	462,00	46,20	23,10
19	Емкость осипивичи 5 м³, инв. № 105-О	367,20	36,72	18,36
20	Емкость д/топлива п/х 5 м³, инв. № 1766	367,20	36,72	18,36
21	Цистерна 25м (1), инв. № 225Т	469,80	46,98	23,49
22	Цистерна д/т 10 м3 (3), инв. № 226вТ	540,00	54,00	27,00
23	А/м ГАЗ 31105 38-63 ва-5, инв. № 310-О	648,00	64,80	32,40
24	Индикатор влажности WILE 26, инв. № 314Т	70,20	7,02	3,51
25	Влагомер сена сенажа си Фауна-М, инв. № 316	39,96	4,00	2,00
26	Каток водоналивной, инв. № 52-О	648,00	64,80	32,40
27	Охладитель молока, инв. № 52-О2	918,00	91,80	45,90
28	Емкость 3 м³ б/у, инв. № 6026	156,60	15,66	7,83
29	Борона б/у, инв. № 6028	86,40	8,64	4,32
30	Фреза ДМР-4000 б/у, инв. № 6029	6264,00	626,40	313,20
31	Охладитель молока, инв. № 611Т	1350,00	135,00	67,50
32	Водораздатчик вчс-3 2 м³, инв. № 619Т	210,60	21,06	10,53
33	Сеялка ферабокс, инв. № 691Т	3456,00	345,60	172,80
34	ножницы шил., инв. № 717	491,40	49,14	24,57
35	Кран 0,5т шил., инв. № 786	405,00	40,50	20,25
36	Кран опорный гп шил. 11 м, 3 т, инв. № 878	1674,00	167,40	83,70
37	Кран опорный гп шил. 11 м, 2 т, инв. № 879	1458,00	145,80	72,90
38	Кранбалка 11м шил., 2 т, инв. № 886	1458,00	145,80	72,90
39	Грабли колесно-пальцевые ГРЛ-8,5, инв. № 1340	2508,00	250,80	125,40
40	Мтз-82 77-176э, инв. № 14-О	4026,00	402,60	201,30
41	Станок сом-400б, инв. № 1568	363,00	36,30	18,15
42	Водонагреватель, инв. № 3062	330,00	33,00	16,50
43	Водонагреватель, инв. № 3074	330,00	33,00	16,50
44	Водонагреватель, инв. № 321-О	39,60	3,96	1,98
45	Водонагреватель, инв. № 322-О	39,60	3,96	1,98
46	Косилка ротац. навесная ас-1-014 рб, инв. № 6001	990,00	99,00	49,50
47	Косилка ротац. навесная ас-1-02, инв. № 6005	1320,00	132,00	66,00
48	Мтз-82 осип.46-18мв, инв. № 8-О	6006,00	600,60	300,30
49	Станок токарно-винторезный 1Е61МТС, инв. № 829	1452,00	145,20	72,60
50	Мтз-80 02-63бэ, инв. № 9-О	3102,00	310,20	155,10

В отношении лота № 1 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7. В отношении лотов №№№ 2-4 проводятся восьмые повторные торги. **Стоимость снижена на 85 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 39 (29661) от 26.02.2022, стр. 15, № 69 (29691) от 09.04.2022, стр. 10, № 83 (29705) от 29.04.2022, стр. 14, № 95 (29717) от 18.05.2022, стр. 15, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 145 (29767) от 27.07.2022, стр. 11, № 160 (29782) от 17.08.2022, стр. 17. В отношении лотов №№№ 5-18 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 69 (29691) от 09.04.2022, стр. 10, № 95 (29717) от 18.05.2022, стр. 15, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 145 (29767) от 27.07.2022, стр. 11, № 160 (29782) от 17.08.2022, стр. 17. В отношении лотов №№№ 19-38 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 55 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 83 (29705) от 29.04.2022, стр. 14, № 113 (29735) от 11.06.2022, стр. 3, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 145 (29767) от 27.07.2022, стр. 11, № 160 (29782) от 17.08.2022, стр. 17. В отношении лотов №№№ 39-50 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 45 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 101 (29723) от 26.05.2022, № 129 (29751) от 05.07.2022, стр. 7, № 145 (29767) от 27.07.2022, стр. 11, № 160 (29782) от 17.08.2022, стр. 17

Местонахождение лота № 1: Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, аг. Шиловичи, ул. Советская, 9/7.
Лот № 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 621385412101000188, площадью 0,4354 га, для строительства и обслуживания крытой автомобильной стоянки. Право постоянного пользования.
Местонахождение лотов №№ 2–50: Минская обл., Вилейский р-н, д. Осиповичи

В отношении Лота № 1 имеется обременение в виде аренды. По вопросам обременений обращаться по тел. +375293489225, Олег

Дата и время проведения торгов	**21 сентября 2022 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127**
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**с 10.00 8 сентября 2022 года до 16.00 19 сентября 2022 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 21.09.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 5 % от конечной цены предмета торгов (по Лоту № 1); 7 % от конечной цены предмета торгов (по Лотам №№ 2–50).**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Чеслав, тел. +375299999112. Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293042560, Андрей.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375293489225, +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая 105, УНП 600010756)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113 г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Автотрансстрой»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Кап. строение с инв. № 630/С-79467 (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства; наименование – автозаправочный пункт, общая площадь – 8,9 кв. м)	58 450,00	5 845,00	2 922,50
2	Пылесос «ЗИЛ-900», инв. № 628	280,80	28,08	14,04
3	Сверлильный станок 2Н 125, инв. № 680	1 728,00	172,80	86,40
4	Огнетушитель ОУ-80, инв. № 707	417,60	41,76	20,88
5	Огнетушитель ОУ-80, инв. № 708	417,60	41,76	20,88
6	Станок 3Б-634 точильно-шлифовальный, инв. № 713	410,40	41,04	20,52
7	Обдирочно-шлифовальный станок 3Б633, инв. № 715	280,80	28,08	14,04
8	Сверлильный станок 2Н135, инв. № 718	1 872,00	187,20	93,60
9	Станок хонинговальный 3Г833, инв. № 721	1 656,00	165,60	82,80
10	Станок 2М112 настольно-сверлильный, инв. № 768	460,80	46,08	23,04
11	Пневмомолот М41-32А, инв. № 750	2 880,00	288,00	144,00
12	Сверлильный станок 2Н125, инв. № 751	1 728,00	172,80	86,40
13	Сверлильный станок 2Н135, инв. № 760	1 872,00	187,20	93,60
14	Станок 2М 122 настольно-сверлильный, инв. № 795	460,80	46,08	23,04
15	Мерник образ. М2Р-50, инв. № 1026	302,40	30,24	15,12
16	Компрессор У-43102А, инв. № 6071	720,00	72,00	36,00
17	Автомобиль МАЗ 543205-226 АВ 3553-5, инв. № 12599	3 960,00	396,00	198,00
18	Автомобиль МАЗ 5516А5 АЕ 9721-5, инв. № 12718	8 064,00	806,40	403,20
19	Автомобиль МАЗ-551605-271 АИ 7406-5, инв. № 12769	8 064,00	806,40	403,20
20	Полуприцеп КЕГЕЛЬ SN 24 74-24 АА-5, инв. № 19887	4 536,00	453,60	226,80
21	Автомобиль МАЗ 5440А5-330-000 АК 0727-5, инв. № 10677	6 480,00	648,00	324,00
22	Ноутбук Samsung NP-R70, инв. № 480001	50,40	5,04	2,52
23	Верстак слесарный, 23 шт. (инв. Номер 637), инв. № 637-658	5 630,40	563,04	281,52
24	Шкаф металлический, 28 шт., инв. № 924-951	4 032,00	403,20	201,60
25	Стол для руководителя, инв. № 7007	194,40	19,44	9,72
26	Металлические стеллажи, согласно списку № 1: https://docs.google.com/document/d/10fWY96-jCQmPJ98wyn3JnlhH8ZNB-LOs/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	158,40	15,84	7,92
27	Имущество, согласно списку № 2: https://docs.google.com/document/d/12RSNzANk4zPn9gMNobWpbiSaEVNDe9cK/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	788,92	78,89	39,45
28	Имущество, согласно списку № 3: https://docs.google.com/document/d/1I3DDGZ38qGG4vGQnW-p4ylwmEbJeqb7t/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	337,80	33,78	16,89
29	Имущество, согласно списку № 4: https://docs.google.com/document/d/1grRy4m3qcP7qxoLsPHO3qRMVBPV4iSx_/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	316,80	31,68	15,84
30	Кабина «МАЗ»	3 456,00	345,60	172,80
31	Имущество, согласно списку № 5: https://docs.google.com/document/d/1HxadctxYycwzxTjXP_dBNU0ihvk7lXZ-/edit?usp=sharing&ouid=107336927377324979075&rtpof=true&sd=true	273,61	27,36	13,68
32	Автомобиль ГАЗ-2705, АР 6310-5, г. в. 1999	2 304,00	230,40	115,20
33	Автомобиль МАЗ-551605-271, АК 0692-5, г. в. 2010	29 376,00	2 937,60	1 468,80
34	Автомобиль «Фольксваген Шаран», 1244 ВН-5, г. в. 1995	6 720,00	672,00	336,00
35	Капитальное строение с инв. номером 630/С-49330 (назначение – Здание административно-хозяйственное, наименование – Административное здание, общая площадь – 1 944,2 кв. м)	934 080,00	93 408,00	46 704,00

В отношении лота № 1 проводятся пятые повторные торги. **Стоимость снижена на 65 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 86 (29708) от 05.05.2022, стр. 14, № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14, № 130 (29752) от 06.07.2022, стр. 11, № 144 (29766) от 26.07.2022, стр. 6, № 160 (29782) от 17.08.2022. В отношении лотов №№ 2–30 проводятся третьи повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 117 (29739) от 17.06.2022, стр. 14, № 144 (29766) от 26.07.2022, стр. 6, № 160 (29782) от 17.08.2022. В отношении лота № 31 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 144 (29766) от 26.07.2022. В отношении лотов №№ 32–35 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 138 (29760) от 16.07.2022, стр. 4, № 165 (29787) от 24.08.2022

Местонахождение лота № 1: Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2/5.
Лот № 1 и № 35 расположены на земельном участке с кадастровым номером 642000000003000030, площадью 4,4255 га, для обслуживания и эксплуатации производственной базы. Право аренды Продавца (83/100 доли).
Местонахождение лотов №№ 2–35: Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2

Ограничения (обременения)	В отношении лота № 1: аренда открытой площадки с бетонным покрытием (является составным элементом автозаправочного пункта) для осуществления хозяйственной и иной деятельности до 14.11.2025. В отношении лота № 36: аренда помещений: 82,6 кв. м, 7.7 кв. м, 20,4 кв. м (по 31.12.2022), 12,9 кв. м (по 28.01.2023), 156,47 кв. м (по 10.01.2027), 34,3 кв. м (по 31.12.2025), 19,4 кв. м, 102,9 кв. м (по 31.12.2025). Земельный участок с кадастровым номером 642000000003000030 имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: код 5,1 – площадь 0,7390 га; код 5,2 – площадь 0,7390 га; код 5,5 – площадь 0,7390 га; код 5,7 – площадь 0,7390 га
Дата и время проведения торгов	**21 сентября 2022 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**с 10.00 08 сентября 2022 года до 16.00 19 сентября 2022 года**

Условия для участия в торгах:
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: OTHR 40901. Задаток для участия в торгах по Лоту __, ОАО «Автотрансстрой», проводимых __.__.2022.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов).
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – по Лотам №№№ 1; 35 – 5 %, по Лотам №№№ 2–34 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов **– Александр Николаевич, +375292627504. Дополнительная информация по лотам №№№ 1, 35 по тел.: +375293042560, +375293082762.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**ОАО «Автотрансстрой» в лице ликвидатора – ООО «Центр антикризисных проектов», тел.: 80172552928; +375293489225 (Минская обл., г. Молодечно, ул. Тамары Дудко, д. 2, УНП 600077182)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
8 ВЕРАСНЯ 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 15 (15938)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Камертон настрою

Аляксей ЧАРОТА:

«Па творы заўсёды заўважна, ці атрымаецца з маладога чалавека пісьменнік»

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Мы жывём у віры эмоцый. Асабліва востра гэта адчуваюць падлеткі, якія сутыкаюцца са спектрам розных праблем: пачынаючы ад унутраных страхаў і незадаволенасцяў і заканчваючы знешнімі канфліктамі, напрыклад, булінгам у школе. Некаторыя з іх звяртаюцца да літаратуры — сапраўды, напісанне вершаў або апавяданняў дапамагае выплеснуць увесь назапашаны негатыў. Падчас такой творчасці некаторыя з хлопцаў і дзяўчат разумеюць, што літаратура для іх — не толькі хобі або інструмент для разрадкі, але і справа, якой яны хацелі б займацца прафесійна. Каб даведацца, у якім напрамку рушыць маладому аўтару, «Чырвонка. Чырвоная змена» звярнулася да Аляксея Чароты, галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва». Герой інтэрв'ю распавёў, што зусім нядаўна пры Саюзе пісьменнікаў Беларусі быў створаны Савет па рабоце з моладдзю, адной з задач якога з'яўляецца падтрымка таленавітых хлопцаў і дзяўчат.

— Гэты Савет быў арганізаваны ў маі, а ўзначальвае яго маладая пісьменніца Ганна Чыж-Літаш. Падчас першага пасяджэння ўдзельнікі пазнаёміліся паміж сабой і выбудавалі кірункі далейшай работы. Плануецца, што Савет дапаможа ў папулярызацыі літаратуры сярод моладзі праз арганізацыю сустрэч маладзёжных калектываў, падчас якіх удзельнікі абмяркуюць сучасную беларускую літаратуру, а таксама падзеляцца ўласнай творчасцю.

— На вашу думку, які фармат работы пісьменніка з моладдзю самы паспяховы?

— Непасрэдныя стасункі: сустрэчы ў школах, у вышэйшых і прафесійных установах. Прымусіць чытаць вельмі складана, асабліва калі малады чалавек гэтага не хоча. Мае калегі дзяліліся, што калі яны прыходзілі ў аўдыторыю і распавядалі пра сваю творчасць, то назіралі іншы ўзровень цікавасці. Ад навучэнцаў пачатковых школ неаднойчы чуў: «А што, ёсць жывыя пісьменнікі?» Калі да іх звяртацца асабіста, яны бачаць, што пісьменнікі — гэта такія ж людзі, як і яны самі. З імі цікава размаўляць, яны добра знаёмяць з літаратурай. Гэта самы эфектыўны сродак.

— Ці сапраўды ў чытацкім маладзёжным полі назіраецца моцны спад цікавасці?

— Магчыма, спад цікавасці ёсць менавіта да папяровай кнігі. Мне здаецца, што шмат людзей карыстаюцца электроннымі сродкамі. І казаць, што наша моладзь не чытае зусім, — няправільна.

— Калі казаць пра моладзь, якая піша... Ці часта яна звяртаецца ў літаратурныя часопісы?

— Нам вельмі часта дасылаюць творы. Калі я працаваў у часопісе «Нёман», мы атрымлівалі іх не толькі з Беларусі, але і з Расіі, з Ізраіля. Зараз у «ЛіМ» таксама дасылаюць прозу, паэзію і нават крытыку.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Проба пяра

ПРА ТОЕ, ШТО НАС УСІХ АБ'ЯДНОЎВАЕ

Працягваем друкаваць найлепшыя работы конкурсу «Адзіная краіна — адзіны народ»

У Год гістарычнай памяці маладзёжны дадатак «Чырвонка. Чырвоная змена» да найстарэйшага беларускамоўнага выдання «Звязда» сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі аб'явілі творчы конкурс для школьнікаў і студэнтаў, маладых спецыялістаў пад назвай «Адзіная краіна — адзіны народ».

У ім мы прапанавалі патэнцыяльным удзельнікам паразважаць на тэму патрыятызму, любові да сваёй Радзімы, захавання гістарычнай спадчыны, знакавых для нашай краіны сучасных падзей. Першы цыкл найлепшых творчых работ быў апублікаваны ў «Чырвонцы. Чырвонай змене» 4 жніўня (заяўкі на ўдзел прымаліся да 31 жніўня). Сёння мы працягваем друкаваць новыя пробы пяра, якія паступілі на конкурс. Трэба зазначыць, што многія ўдзельнікі актывізаваліся, як той казаў, літаральна ў перадапошні і апошні час да тэрміну заканчэння нашага творчага спаборніцтва. Ну, зусім па школьнай звычцы, калі да экзамену пачынаюць рыхтавацца напярэдадні! Разам з тым варта адзначыць і дастаткова высокі ўзровень напісання гэтых работ. Таму «Чырвонка. Чырвоная змена», як і было адзначана ва ўмовах конкурсу, працягвае публікацыю найлепшых проб пяра пасля яго заканчэння. Сачыце за маладзёжным дадаткам і чакайце падвядзення вынікаў!

(Працяг тэмы на 3 стар. «ЧЗ».)

З нагоды

ЯКІЯ НАШЫ ГАДЫ?! САЮЗ МОЛАДЗІ — ВЕЧНА МАЛАДЫ!

6 верасня Беларускаму рэспубліканскаму саюзу моладзі споўнілася 20 гадоў. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў грамадскае аб'яднанне з гэтай датай, назваўшы БРСМ стартавай пляцоўкай для многіх ініцыятыў і сапраўдным сацыяльным ліфтам для юных талентаў.

На працягу дэкады ў краіне праходзіць шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных 20-годдзю Саюза моладзі. Так, сумесныя памятныя мерапрыемствы, арганізаваныя ГА «БРСМ», Беларускім культурным цэнтрам духоўнага Адраджэння з удзелам моладзі і асноўных рэлігійных канфесій Рэспублікі Беларусь, прысвечаныя Дню Памяці ахвяр лагера смерці «Трасцянец», адбыліся 3 верасня. Сустрэча дэлегацыі прайшла на тэрыторыі Мемарыяльнага комплексу «Храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія выратаванню Айчыны нашай паслужылі». Каля скрыні з прахам ахвяр лагера смерці адбылася памінальная ліція. У далейшай праграме быў

Фота БРСМ.

велапрабег па маршруце Храм-помнік — Мемарыяльны комплекс «Трасцянец». Потым — жалобны мітынг каля скульптурнай кампазіцыі «Брама Памяці». Завяршыла ўсё міжканфесійная малітва з удзелам прадстаўнікоў асноўных рэлігійных канфесій у Рэспубліцы Беларусь і моладзі.

Яшчэ адным мерапрыемствам, прымеркаваным да 20-годдзя БРСМ, стала гістарычная дыктоўка («Дыктоўка Перамогі»), якая таксама прайшла 3 верасня. Яна была прысвечана тэме падзей Вялікай Айчыннай вайны і адбылася на 136 пляцоўках (у школах, ВНУ, ССНУ, бібліятэках, дамах культуры і інш.). У дыктоўцы бралі ўдзел больш за тысячу актывістаў БРСМ з усіх рэгіёнаў краіны і Мінска. Ім трэба было на працягу 45 хвілін адказаць на 25 пытанняў, звязаных з укладам беларускага народа ў Вялікую Перамогу. Пераможцы праекта — 21 чалавек — па тры з кожнага рэгіёна і сталіцы — былі ўзнагароджаны сертыфікатамі праекта і памятнымі сувенірамі.

Напярэдадні дня нараджэння, 5 верасня, адбыўся адкрыты дыялог «Равеснікі БРСМ» з актывістамі Саюза моладзі, якім сёлета споўнілася 20 гадоў, і хлопцамі і дзяўчатамі, якія толькі ўступілі ў рады БРСМ.

6 верасня прайшоў Дзень моладзі «БРСМ: 20 гадоў разам!» Мерапрыемства адбылося ў Мінскім гарадскім палацы культуры ў выглядзе святочнага храналога «БРСМ: Учора. Сёння. Заўтра!» — гісторыя станаўлення і развіцця маладзёжнай арганізацыі праз прызму прэзентацыі асноўных напрамкаў яе дзейнасці, з ушанаваннем актыву, віншаваннем БРСМ з юбілеем ад ганаровых гасцей і партнёраў, яркімі творчымі нумарамі ад удзельнікаў праектаў БРСМ — папулярных артыстаў беларускай эстрады і маладзёжных творчых калектываў.

«Чырвонка. «Чырвоная змена» далучаецца да шматлікіх віншаванняў свайго сузасноўніка і партнёра — Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі! Пацвярджэнне нашага супрацоўніцтва — сумесны ў Год гістарычнай памяці творчы конкурс «Адзіная краіна — адзіны народ», найлепшыя работы якога мы працягваем друкаваць у тым ліку і ў гэтым нумары.

Бачыць мэту

Школа маладога вучонага

Беларуска-расійскі праект з такой назвай плануюць рэалізаваць у БДУ. Ініцыятыва стварэння сумеснай школы належыць выкладчыку факультэта міжнародных адносін БДУ Анастасіі КІСЯЛЕВІЧ.



Фота bsu.by.

«Мэтай праекта з'яўляецца развіццё цікавасці да навукі і аказанне экспертнай падтрымкі маладым вучоным, фарміраванне ў іх навыкаў прасоўвання сваіх даследаванняў з дапамогай інтэрнэту. Як намеснік старшыні Савета маладых вучоных пры Міністэрстве адукацыі я заўважала, што часам складана распрацоўшчыку, вучонаму расказаць пра сваю работу, прэзентаваць яе, знайсці аднадумцаў і проста зацікаўленых. Узнікла думка стварыць унікальную прастору, дзе супрацоўнікі ВНУ і навукова-даследчых арганізацый падзеляцца вопытам, ведамі і прыцягнуць маладое пакаленне да навуковай дзейнасці», — адзначыла выкладчык.

Канцэпцыя праекта прадугледжвае правядзенне адукацыйных сесій. Яны будуць уключаць заняткі з выкладчыкамі БДУ і расійскіх ВНУ, тэматычныя майстар-класы па запыце маладых вучоных, дыскусіі і сустрэчы з вядомымі вучонымі і экспертамі ў розных сферах дзейнасці, прадстаўнікамі навуковых СМІ. Вынікам навучання стане пабудова карты кар'еры, наладжванне супрацоўніцтва з аднадумцамі, партнёрамі, сумесная публікацыя артыкулаў з калегамі з іншых ВНУ.

Запуск праекта запланаваны на снежань. Першымі слухачамі школы стануць 20 маладых вучоных з Беларусі і Расіі. Інфармацыю аб наборы ў школу размесцяць на сайтах БДУ і Фонду публічнай дыпламатыкі імя А. М. Гарчакова (Расія). Адбор адбудзецца па выніках ацэнкі матывацыйнага ліста і праблематыкі заяўленага навуковага праекта.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Справы маладых

ЯНЫ НАСІЛІ «БАЙЦОЎКІ»

На якіх аб'ектах працавалі студатрады гэтым летам?

Трэці працоўны семестр выйшаў на фініш, большасць студэнтаў беларускіх ВНУ ўжо вярнуліся ў вучэбныя аўдыторыі і прыступілі да заняткаў. Штогод студатрадаўскі рух аб'ядноўвае дзясяткі тысяч маладых людзей. Справа іх рук — не разавыя «акцыі» і кіруюцца яны не толькі жаданнем зарабіць, а магчымасцю быць датычнымі да ўзвядзення знакавых аб'ектаў краіны. Сярод іх — Нацыянальная бібліятэка, «Мінск-Арэна», стадыён «Дынама», Аўтастоўскі канал, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Беларуская АЭС. У гэтым годзе статус Усебеларускай маладзёжнай будоўлі атрымала рэканструкцыя Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь».

З сакавіка ў краіне быў запушчаны праект «Выбіраем студатрад»: у кожнай установе адукацыі і ў кожным раённым камітэце БРСМ ішоў набор хлопцаў і дзяўчат, якія жадалі папоўніць іх шэрагі. У некаторых атрадах конкурс даходзіў да чатырох чалавек на месца, як, напрыклад, у педагагічным атрадзе «Сузор'е» Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта. У яго склад уваходзяць найлепшыя прадстаўнікі факультэтаў і інстытутаў гэтай ВНУ. Першакурснікаў сюды не бяруць, бо ім не хапае вопыту, — толькі студэнтаў пасля другога і трэцяга курсаў. Атрад працуе на базе Нацыянальнага дзіцячага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня», дзе прад'яўляюцца вельмі высокія патрабаванні да работы важатых. За сямігадовую гісторыю атрад двойчы (у 2020 і 2021 гадах) станавіўся пераможцам Рэспубліканскага конкурсу «Працоўны семестр» у намінацыі «Найлепшы педагагічны атрад Рэспублікі Беларусь».

Фота bsu.by.

Маладыя гісторыкі займаліся вывучэннем публікацый пасляваеннага перыяду. Даследаваліся выпускі газет «Звязда» і «Советская Белоруссия» з 1945 да 1960-х гадоў.

— Атрад «Сузор'е» — гэта сям'я, калектыў аднадумцаў, мы паважаем і памнажаем традыцыі студатрадаўскага руху, — сцвярджае **камандзір атрада Аліна ВАСІЛЬЕВА**. — Да працоўнага семестра пачынаем рыхтавацца яшчэ ў лютым. Для ахвотных трапіць да нас арганізоўваюцца і лекцыйныя, і практычныя заняткі, а на фінішы адбіраюцца найлепшыя. Лічу найвышэйшай ацэнкай нашай працы водгукі выхаванцаў, якія напрыканцы змены цікавяцца ў нас, як можна стаць важатымі. Я сама была некалі выхаванкай Нацыянальнага адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Зубраня», потым валанцёрыла там, дапамагала важатым і зразумела, што мне вельмі падабаецца

Дарэчы, падчас трэцяга працоўнага семестра дзяржаўныя інспектары працы пабывалі ў 400 студэнцкіх атрадах і вывучылі іх дзейнасць. «У цэлым, усё адпавядала ўстаноўленым правілам: заключаліся працоўныя дагаворы пры накіраванні і прыёме на працу, праводзіўся медыцынскі агляд, інструктаж па тэхніцы бяспекі, азнаямленне са службовымі інструкцыямі, — расказаў **першы намеснік дырэктара Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН**. — Заўважу, што прадпрыемствы, якія бяруць на работу студэнтаў, абавязаны забяспечыць адпаведныя дагавору аб'екты і віды работ, а таксама стварыць на кожным працоўным месцы бяспечныя ўмовы працы, забяспечыць іх сродкамі індывідуальнай аховы, спецвопраткай і іншым. Па ўсіх выяўленых парушэннях выдаваліся рэкамендацыі па іх выпраўленні, і ўсе яны пры магчымасці неадкладна выпраўляліся ў прысутнасці інспектараў».

Фота bspu.by.

Педагагічныя атрады даюць каштоўны вопыт. Тут можна ўдасканаліць прафесійныя якасці, навучыцца рабоце ў камандзе, праявіць арганізацыйныя здольнасці і лідарскія якасці.

працаваць менавіта з маленькімі дзецьмі. Гэта дапамагло вызначыцца з прафесіяй, я паступіла на факультэт пачатковай адукацыі і цяпер сама ўжо выступаю ў ролі важатай. Адным словам, «Зубраня» не адпускае мяне ўжо дзесяць гадоў. Мы тлумачым дзецям, што трэба вывучыцца на педагога і піярым свой універсітэт.

— З прычыны спецыфікі ВНУ амаль усе ўніверсітэцкія студатрады ў нас педагагічнага профілю, — канстатуе **начальнік упраўлення выхаваўчай работы з моладдзю БДПУ Святлана МАЛІНОЎСКАЯ**. — І яны вельмі запатрабаваныя студэнцкай моладдзю, бо даюць каштоўны педагагічны вопыт. Тут можна навучыцца рабоце ў камандзе, праявіць свае творчыя і арганізацыйныя здольнасці, лідарскія якасці, ну і, вядома, зарабіць першыя грошы. Гэтым летам у БДПУ былі створаны 43 педагагічныя і адзін сэрвісны атрад. Было працаўладкавана 680 студэнтаў. Нашы хлопцы і дзяўчаты працавалі на базе дзевяці дзіцячых аздараўленчых лагераў, двух аздараўленчых комплексаў, аднаго санаторыя, у Нацыянальным дзіцячым адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня», у дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Жамчужына». Яшчэ тры атрады працавалі на працягу навучальнага года. Адзін дапамагаў работнікам «Белпошты» і два атрады факультэта дашкольнай адукацыі займаліся арганізацыяй адпачынку дзяцей падчас вясенніх канікул.

— БНТУ — флагман тэхнічнай адукацыі, ён вельмі шматпрофільны. Таму і студатрады ў нас разнайстайныя: і будаўнічыя, і вытворчыя, і экалагічныя, і сэрвісныя. Ёсць і педагагічны, таму што ва ўніверсітэце функцыянуе інжынерна-педагагічны факультэт. Але трапіць у педатрад пры жаданні могуць таксама і студэнты з іншых факультэтаў, калі пройдуць адпаведную падрыхтоўку. Яна, дарэчы, займае два месяцы. Каля 200 нашых студэнтаў гэтым летам працавалі з дзецьмі ў санаторыі-прафілакторыі БНТУ «Палітэхнік», — расказаў **сакратар першычнай арганізацыі БРСМ Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Ягор НІКІЦІН**. — Са студзеня бягучага года мы працаўладкавалі 1576 студэнтаў у складзе 49 студатрадаў. Але найбольшы ўпор рабілі, вядома, на лета. Студэнты працавалі на ўсіх знакавых аб'ектах і рэспубліканскіх праектах: «Аўтазаводзец», «Трактарабудаўнік-2022», «Атлант» , Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк, на рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Наш сэрвісны атрад працаваў у Расіі, у Туапсэ, у аздараўленчым лагеры. Акрамя таго, мы вельмі ўдзячныя кіраўніцтву нашай ВНУ, якое выдзеліла шмат месцаў для працаўладкавання непасрэдна ва ўніверсітэце: хлопцы і дзяўчаты працавалі на кампусе, у студэнцкім гарадку, таксама з метадычнай дакументацыяй на кафедрах. А пасля завяршэння работы ўсіх чакала вельмі цікавая і насычаная праграма з мноствам актыўнасцяў, пазнавальных экскурсій, культурных мерапрыемстваў, бо студатрад — гэта не толькі магчымасць зарабіць...

— У БДУ гэтым летам у складзе 39 атрадаў працавалі 986 студэнтаў: гэта былі сельскагаспадарчыя, сэрвісныя, педагагічныя, вытворчыя і будаўнічыя атрады, — паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення па выхаваўчай рабоце з моладдзю Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Ягор ПАДАЛЯК**. — Сэрвісны атрад «Абітурыент» дапамагаў прыёмнай камісіі падчас уступнай кампаніі. У спартыўна-аздараўленчым комплексе «Брыгантына» ўсё лета працавалі нашы «педагогі». Але асобна хацеў бы спыніцца на рабоце студэнцкага сэрвіснага атрада «Памяць і Слава» імя першага рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты. Яго ўдзельнікі на працягу летняга перыяду займаліся даследаваннем архіўных дакументаў для захавання і перадачы наступным пакаленням гістарычнай праўды.

Студэнты гістарычнага факультэта правялі маштабную работу па ўстанаўленні біяграфічных даных ваеннапалонных лагера «Шталаг-352» у Масюкоўшчыне. Хлопцы і дзяўчаты вялі пошук і верыфікацыю звестак аб вязнях па кнізе памерлых лазарэта лагера. Усяго ўдалося знайсці інфармацыю аб 789 людзях. Сабраны матэрыял папоўніць рэспубліканскую базу даных.

Таксама маладыя гісторыкі займаліся вывучэннем публікацый цэнтральнага перыядычнага друку Беларусі пасляваеннага перыяду ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Даследаваліся выпускі газет «Звязда» і «Советская Белоруссия» з 1945 да 1960-х гадоў. Студэнты знайшлі 63 навінавыя нататкі і артыкулы са звесткамі пра БДУ. Адной з цікавых знаходак стаў аўтарскі артыкул тагачаснага рэктара БДУ Парфёна Савіцкага аб аднаўленні ўніверсітэта і яго дзейнасці пасля Вялікай Айчыннай вайны, які быў апублікаваны ў пятым нумары газеты «Звязда» ад 7 студзеня 1944 года.

Фота bsu.by.

Студатрад «Памяць і Слава» працаваў над добраўпарадкаваннем пахаванняў прафесарска-выкладчыцкага складу БДУ на Ваенных, Паўночных і Усходніх могілках Мінска.

Пастскрыптум ад бацькоў выхаванцаў НДЦ «Зубраня»:

• «Зацікавіць, арганізаваць пакаленне NEXT каштуе вялікай працы і каласальнага цярпення. У вас, паважаныя важатыя, усё атрымалася на 10+. Вялікі дзякуй вам за незабыўны адпачынак нашых дзяцей!»

• «Мілыя нашы важатыя, вы і ёсць малайцы! Шчыры дзякуй вам за вашу працу! Нават не сумняваюся, што дзеці ўжо заўтра будуць па вас сумаваць!»

Акрамя таго, студатрад працаваў над добраўпарадкаваннем пахаванняў прафесарска-выкладчыцкага складу ўніверсітэта на Ваенных, Паўночных і Усходніх могілках Мінска. Усяго прыведзена ў парадак больш за 70 месцаў спачыну. Работа па пошуку і добраўпарадкаванні пахаванняў супрацоўнікаў БДУ вядзецца з 2020 года.

Як зазначыў Ягор Падаляк, нікога са студэнтаў не пакідаюць раўнадушнымі сустрэчы з ветэранамі студатрадаўскага руху, бо гэта дапамагае зразумець сувязь пакаленняў, што студатрадаўскі рух, які ў наступным годзе адзначыць сваё шасцідзесяцігоддзе, мае багатыя традыцыі і гісторыю. «Напрыклад, мая бабуля ў студэнцкія гады ў складзе будатрада працавала на ўзвядзенні Кургана Славы». І яе аповеды вельмі цікава слухаць...» — расказаў ён.

А вы ведаеце, што сёння кажуць байцы студатрадаў? «Мы едзем на цаліну». Так яны называюць месца работы і пражывання атрада, працу ў складзе будатрада на аб'ектах АЭС і не толькі. Савецкая тэрміналогія прыжылася і актыўна выкарыстоўваецца. Увогуле, у студатрадаўцаў ёсць свой слоўнік, які ўключае як сучасныя паняцці (хто такі камандзір, камісар, якія існуюць віды студатрадаў і г. д.), так і словы з гісторыі студатрадаўскага руху. Узаемавыручка, мэтанакіраванасць, адказнасць за справу — гэтыя паняцці ўласцівыя не толькі папярэднім пакаленням, але і сучасным байцам студатрадаў. Магчыма, студатрадаўскі рух — найлепшае, што сучасны Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі ўзяў ад камсамола.

Надзея НІКАЛАЕВА.

СТВАРАЕМ СВАЮ КАЗКУ, або Едзем у госці да Мерабель

Яшчэ ва ўтульныя часы СССР тэрыторыя паблізу вёскі Мерабель заўсёды была напоўнена смехам і марамі, бо раней у гэтых месцах дзейнічалі адразу чатыры піянерскія лагеры: «Юны нафтаразведчык», «Брыганціна», «Зорачка» і «Мара». Апошні са згаданых лагераў быў выкуплены і пераабсталяваны пад базу адпачынку каля 30 гадоў таму. Такую вялікую адказнасць узяў на сябе Іван Васільевіч Сарока. Савецкае мінулае «Мары» адчуваецца дагэтуль — чаго варты адны толькі кветнікі ў выглядзе пяціканцовых зорак і вялізнае футбольнае поле! Утульныя сучасныя зоны адпачынку, танцавальныя і гульнявыя пляцоўкі, сажалка з бусламі за млыном ствараюць атмасферу чагосьці неверагоднага, мілага і роднага. Нічога гэтага не было б, калі б Іван Васільевіч не ўкладваў у рамонт і афармленне не толькі шмат сіл ды часу, але яшчэ і душу. Тут назаўжды пасяліўся дух рамантыкі і прыгод. У гэтым прыцягальным і камфортным казачным месцы праходзіць наш камунікацыйны праект «У госці да Мерабель».

Мы, юныя журналісты, вось ужо некалькі гадоў запар рэгулярна разгортваем свой дзевяцідзённы палатачны лагер «Лясная школа журналістыкі» побач з базай адпачынку «Мара». Але ў нашы планы свае карэктывы ўнесла пандэмія, таму цяпер мы праводзім міні-лагер на адзін-два дні ў лясным масіве базы адпачынку.

Такім чынам, рана-рана ў выхадны дзень дзеці садзяцца ў аўтобус са сваімі педагогамі і едуць у вёску Мерабель, адкуль рукою падаць да базы адпачынку «Мара». Як толькі мы ўваходзім у лес — пачынаецца казка: птушкі сустракаюць нас сваімі мілымі спевамі, свежы і духмяны пах напаўняе лёгкія, удалечыні віднеюцца стромкія яры з аголенымі каранямі хвой-волатаў, якія засцерагаюць крышталёва чыстую рэчку Мерабелку, — усё гэта валоданні вялікай чараўніцы Лясной Феі Мерабель. А сама рэзідэнцыя знаходзіцца ў цэнтры базы адпачынку, у корпусе з вежай са шпілем. Фея заўсёды рада гасцям, як і дырэктар Іван Васільевіч, які прызнаўся нам, што ўвесь час адчувае тут дзіцячую аўру і імкнецца добраўпарадкаваць тэрыторыю «Мары» ў першую чаргу для дзяцей.

Фея Мерабель першая прайшлася па мосціку.

15 хвілін пешага ходу — і мы ўжо ў «Мары», дзе пачынаецца падрыхтоўка да сустрэчы з Лясной Феяй і яе надзейнымі сябрамі. Уладкаванне лагера, распальванне вогнішча і ўстаноўка палатак патрабуе і часу, і спруту ад усіх удзельнікаў нашай каманды. Менавіта ў лагеры некаторыя хлопцы і дзяўчаты асвоілі садовыя прылады. А абед, прыгатаваны ўласнымі рукамі ва ўмовах дзікай прыроды, самы смачны!

Доўгачаканым момантам нашых лясных прыгод становіцца цёплая сустрэча з Лясной Феяй Мерабель. А хто ж такая Мерабель?

Паводле адной з мясцовых легенд, шторанішы да рэчкі прыходзіла дзяўчына. Яна гадзінамі любавалася воднай гладдзю, і ніхто не ведаў, што прымушае яе туды прыходзіць. Адзін юнак вырашыўся пагаварыць з ёй і атрымаў цікавы адказ: «Рака для мяне — крыніца сіл і натхнення». Час ішоў, і ў вёсцы здарылася гора — эпідэмія. Менавіта ў гэты момант юнак успомніў выдатную дзяўчыну Мерабель і яе прывязанасць да ракі, якая валодае гаючай сілай. Доўга не думаючы, хлопец сабраў усіх жыхароў вёскі і павёў на раку. Многія не верылі ў сілу рачной вады, але гэта была іх апошняя надзея. На наступную раніцу ўсе людзі ў вёсцы былі здаровыя, а сама дзяўчына знікла. У гонар выратавання ўсіх жыхароў вёску назвалі Мерабель, а крыштальную рэчку побач — Мерабелка.

Зараз легендарная Мерабель жыве ў самым выдатным месцы на зямлі — на базе адпачынку «Мара», усяго за дзесяць кіламетраў ад старажытнага Мазыра.

— Мерабель, Мерабель! — сардэчна клічам Фею.

У пышнай нябесна-блакітнай сукенцы з замка выходзіць чараўніца.

— Добры дзень, мае сябры! Рада бачыць усіх вас я. Пахне свежасцю лясной — чараўніцтва ідзе за мной... — і пачынаюцца неверагодныя падзеі, дзе размаўляе Кот Вучоны, прыносіць весці чароўны Голуб, а прыязная Божая Кароўка дапамагае вырашыць любы канфлікт і выправіць выхадкі бесшабашнага Лесуна, нахабнай Кікімары і страшнага Жука-Караеда.

Да кожнага падарожжа ў «Мару» мы самі пішам займальную гісторыю, натхняючыся сюжэтам вядомай румынска-савецкай казкі «Марыя, Мірабэла». І нярэдка ў момант паказу пастаноўка развіваецца сваім непрадказальным ходам, дорачы радасць і здзіўленне ўсім гледачам.

Поўныя запалу і эмоцый, мы працягваем бавіць час з карысцю. Паўдзельнічаць у нашым праекце мы запрашаем сяброў — актывістаў з іншых гурткоў і клубаў цэнтра творчасці, з мазырскай СШ № 16, студэнтаў Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна. Спартыўныя спаборніцтвы, інтэлектуальныя конкурсы, сустрэчы з цікавымі людзьмі і краязнаўцамі даюць зарад стваральнай энергіі, вопыт і яркія ўражанні. Так, напрыклад, сустрэча з кінолагамі паказала, як праходзіць захоп праціўніка і асаблівасці трэніроўкі службовай аўчаркі. Вайскоўцы распавядаюць нам пра сваю фізічную падрыхтоўку, дысцыпліну і нюансы пагранічнай службы, чым зацікаўліваюць шматлікіх юнакоў служыць сваёй Радзіме!

Ідзём да «Мары».

Гісторыя роднага краю — гэта таксама наш інтарэс, мы шукаем інфармацыю пра паходжанне назваў найбліжэйшых населеных пунктаў і з павагай ставімся да зоны адпачынку каля нашай любімай Мерабелкі. Падчас падрыхтоўкі да чарговага палатачнага лагера была пастаўлена задача — добраўпарадкаваць тэрыторыю каля рэчкі, дзе з прычыны падзення дрэў разбурыўся мост. На нашу просьбу пра падтрымку будаўніцтва адгукнулася шмат людзей, а з дапамогай прафесіяналаў усё атрымалася зрабіць на належным узроўні. Маісееўскае лясніцтва выдзеліла матэрыялы і тэхніку — у выніку праз рэчку былі перакінуты дзве вялікія драўляныя асновы. Далей працу ўзначаліў член Мазырскай раённай арганізацыі РГА «Белая Русь» Мікалай Глебаў разам з педагогамі-актывістамі мазырскай СШ № 16 Віктарам Цырулікам, Уладзімірам Гімбутам і святаром Сергіем Капітанам. І хутка ва ўрачыстай атмасферы мы перарэзалі стужачку і адкрылі мост, першай па якім прайшла Мерабель. Зараз на нашым мастку мы праводзім узнагароджанне пераможцаў конкурсаў і спаборніцтваў, фотасесіі, а Фея здзяйсняе свой цуд: абсыпае гасцей на шчасце пялёсткамі кветак увесну і ўлетку, увосень — залатым лісцем, а ўзімку — пухнатым снегам. Дарэчы, масток прыйшоўся па душы і мясцовым жыхарам: ім стала вельмі зручна пераходзіць на іншы бераг у перыяд збору грыбоў і ягад, рыбнай лоўлі. На мосціку праводзяць фотасесіі і маладыя, якія святкуюць Дзень вяселля на базе адпачынку «Мара».

Сустрэча з удзельнікамі клуба «Патрыёт».

Мерабель заводзіць карагод.

Адданыя партнёры нашага праекта — дырэктар базы адпачынку «Мара» Іван Васільевіч Сарока, грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», клірык Тураўскай епархіі Сергій Капітан, супрацоўнікі Маісееўскага лясніцтва — далі нам магчымасць праяўляць ініцыятыву і ўвасабляць у жыццё нашы мары. Мы дзякуем ім ад душы.

Наша далейшая мэта — падштурхнуць грамадскасць да адраджэння піянерскіх лагераў! Няхай засвеціцца побач з нашай «Марай» «Зорачка», вернецца «Юны нафтаразведчык», прычаліць у сваю гавань «Брыганціна»!

А мы пішам новую казку, каб адправіцца ў госці да Мерабель на ўлонне маляўнічай прыроды — па мару і пах лесу.

Алеся ГУРЫН,
вучаніца 11 класа СШ № 11
г. Мазыра,
Соф'я БОБР,
вучаніца 9 класа гімназіі
імя Янкі Купалы
г. Мазыра.

Пра аўтара

Соф'я займаецца ў клубе «Юны журналіст» Мазырскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі ўжо трэці год. Таксама супрацоўнічае з мазырскай грамадска-палітычнай газетай «Жыццё Палесся», удзельнічае ў падрыхтоўцы сумеснага з газетай інфармпраекта «Press-моладзь».

— Па выніках XVII Нацыянальнага конкурсу «Залатая Літара» наш праект атрымаў дыплом лаўрэата ў намінацыі «Найлепшыя матэрыялы маладзёжнай, дзіцяча-юнацкай тэматыкі». У мяне выйшла дзесяць матэрыялаў у прэсе. Я ўваходжу ў творчую групу клуба па рэалізацыі камунікацыйных праектаў «Наша памяць» і «У госці да Мерабель», — падзялілася 14-гадовая Соф'я. — Самае яркае ўражанне гэтага года — удзел у IV Рэспубліканскім маладзёжным фестывалі «Медыясфера-2022», дзе я была ўзнагароджана дыпломам у намінацыі «Друкаванае СМІ» за выданне «Зубастая прэса». А яшчэ сёлета перамагла ў раённым этапе літаратурнага конкурсу «Сіла слова». Апроч журналістыкі, паглыблена вывучаю англійскую мову. Удзельнічаю ў алімпіядах па прадмеце 10-11 класаў і мару звязаць сваё жыццё з замежнымі мовамі.

Пра аўтара

Алеся займаецца ў клубе «Юны журналіст» Мазырскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі ўсяго паўгода. Супрацоўнічае з мазырскай грамадска-палітычнай газетай «Жыццё Палесся», у яе ўжо дзве публікацыі.

— За кароткі прамежак часу дзейнасці ў клубе я «засвяцілася» на шматлікіх навінавых сайтах майго горада і на тэлеканале «Мазыр». Люблю весці мерапрыемствы і ўдзельнічаць у іх падрыхтоўцы. Усё раблю творча, — расказвае пра сябе 16-гадовая аўтарка. — Падабаецца здымацца ў патрыятычных відэапраектах нашага клуба і ўдзельнічаць у ваенна-гістарычных рэканструкцыях разам з іншымі юнымі журналістамі. На працягу дзесяці гадоў займаюся танцамі рознага кірунку. У маёй скарбонцы дзевяць дыпломаў I ступені па выніках рэспубліканскіх конкурсаў і падзяка за актыўны ўдзел у жыцці танцавальнага калектыву.

SEX-БАЛЯСЫ

НА ЗЛОМ МОЗГУ

У савецкім мульціку «38 папугаяў» ёсць, калі памятаеце, такі дыялог паміж Удавам і Малпачкай: «У мяне ёсць думка, і я яе думаю!» — «А можна я яе таксама трошачкі падумаю?» Прапаную чытачам сумесна падумаць у рэчышчы нашых разважанняў над тым, што часам робіцца навокал. Там такое бывае... Як той казаў, на злом мозгу. («Нашы жанчыны самыя прыгожыя ў свеце, але самыя страшныя ў гневе!»)

Напрыклад, як вам такая гісторыя: дзяўчына застала хлопца з палюбоўніцай і проста... лягла спаць побач. («Калі вы заспелі свайго мужа ў ложку з палюбоўніцай, не трэба скандаліць. Проста кладзіцеся побач, дакажыце, што вы — найлепшая!») Пацешнай і неадназначнай гісторыяй са свайго жыцця падзялілася ў TikTok карыстальніца па імені Тэйлар Данэм. Яна расказала, што аднойчы вечарам вярнулася дадому з працы і заспела свайго бойфрэнда з іншай. Гераіня не стала скандаліць, а проста лягла на ложак побач з імі і... заснула. («Мужчыны, калі ў сям'і складваецца канфліктная сітуацыя, задайце сабе пытанне: «Ты хочаш мець рацыю ці быць шчаслівым?») Па словах дзяўчыны, яна была вельмі стомленая пасля 16-гадзіннай змены, таму лаяцца ў яе не было ніякага жадання. Змучаная Данэм толькі папрасіла, каб парачка заканчвала свае справы ў іншым месцы. («— Вы адказваеце на званкі падчас сексу?» — «Калі гэта мой хлопец, дык, канешне ж, так. Я ж яго кахаю.») Пазней расказала, што ў тую ноч спала «як немаўля». Зразумела, раніцай скандал усё ж быў, а ўжо праз некалькі хвілін хлопец стаяў на вуліцы з рэчамі. («Толькі ў слабай жанчыны ва ўсім вінаваты муж. У моцнай ён яшчэ і пакараны».) Карыстальнікі захапіліся ўчынкам гераіні гісторыі, адзначыўшы, што нямногія маглі б праявіць стрыманасць у такой сітуацыі. («Чым мацнейшы гнеў гаспадыні, тым мякчэйшыя адбіўныя».)

У Гамбургу для мужчын прыдумалі цэлы дзіцячы садок на тэрыторыі бара Nox. Праграма называецца Maennergarten і прадугледжвае дзённы догляд «дзяцей». Прыехаўшы па пакупкі, жанчына адводзіць мужчыну ў бар. («Хадзіў у дзіцячы садок, хацеў у школу. Хадзіў у школу, жудасна хацелася ў інстытут. Пайшоў працаваць — ажаніўся! Цяпер сяджу і думаю: і чаго ж мне ў дзіцячым садку не сядзелася?») Там яму прычапляюць на грудзі бэйджык з імем, а жанчыне выдаюць квітанцыю на мужчыну. Вызначыўшы спадарожніка на «пастой», жонка адпраўляецца на шопінг. Каштуе такая паслуга 10 еўра за гадзіну. А чым займаюцца мужчыны ў такім «дзіцячым» садку? Па-першае, іх кормяць, прычым па жаданні — з лыжачкі. Па-другое, яны гуляюць. («А некалі мяне хвалілі толькі за тое, што я паспаў і добра паеў!») Напрыклад, малююць карціны «як дзеці» — апускаюць пальцы ў фарбу і пераносяць свае фантазіі на паперу. Ёсць і больш дарослыя забаўкі. Напрыклад, можна выразаць лобзікам якую-небудзь цацку або пагуляць у аўтамабільчыкі з дыстанцыйным кіраваннем. Той, хто нічога не жадае рабіць, можа проста паспаць. («— Я ўсё ўмею! Есці ўмею. Піць умею. У прыбіральню прашуся, спаць у абед буду. Ну вазьмі мяне ў яслі! Бо так на работу не хочацца!») Роўна ў 18.00 «дзіцячы садок» зачыняецца. Да гэтага часу ўсіх мужчын забіраюць. Але былі выпадкі, калі жанчыны забываліся на сваіх спадарожнікаў ці проста па іх не прыходзілі, тым самым намякаючы на тое, што не хочуць больш працягваць адносіны. («Мужыкі — народ просты. Могуць капаць, могуць не капаць. А жанчыны — яны іншыя. Пакуль не дакапаюцца, не супакояцца».)

49-гадовая Дэбара Ходж заключыла шлюб са сваім... катом, каб домаўладальнік не прымусіў яе пазбавіцца ад жывёлы. («Была сёння ў псіхолага. Расказала яму пра сваё жыццё... Плакаў. Ледзьве супакоіла...») Жанчына сцвярджае, што за некалькі гадоў ёй прыйшлося аддаць трох сваіх улюбёнцаў з-за таго, што домаўладальнікі не дазвалялі трымаць іх у сваіх дамах. Чарговы раз сутыкнуўшыся з падобным патрабаваннем, Дэбара была ў жаху ад таго, што ёй давядзецца пазбавіцца ад свайго пяцігадовага ката Індзі. І тады яна вырашыла выйсці замуж за свайго пухнатага сябра, каб паказаць гаспадару, наколькі яна прывязана да жывёлы. («Жаночая логіка часам нагадвае мне ліцэнзійнае пагадненне — нічога не зразумела, але лепш пагадзіцца».) Дэбара была апранута ў смокінг, а Ідзі — у залатую накідку. Кот нават мяўкаў падчас клятваў. Цырымонію правялі ў парку на паўднёвым усходзе Лондана, вядучай стала сяброўка нявесты. («Размова дзвюх сябровак: — Учора выслухала з вуснаў мужа ўсю праўду пра сябе». — «Ты, мабыць, забіла яго...» — «Не, мне так стала яго шкада. З кім ён жыве?») «Хоць некаторыя могуць падумаць, што гэта дурная ідэя, я хацела цырымоніяй паказаць сваім сябрам, што я вельмі сур'ёзная, — сказала Дэбара. — Маіх дваіх дзяцей не было ў той дзень. Яны таксама думаюць, што мама звар'яцела». («Чым больш камунікую з жаночым полам, тым больш пераконваюся, што любой бабе крышку люлей ніколі не нашкодзіць. Ну, акрамя мяне, канешне ж. Я адзіная нармальная».)

...Не ведаю, што падумалі чытачы з нагоды ўсяго вышэйсказанага, ці спадабалася ім пачутае... Але аўтар нататак, калі б была магчымасць звярнуцца ад імя герояў гэтых гісторый, сказаў бы наступнае. «Калі вам ува мне нешта не падабаецца, неабавязкова ставіць мяне аб гэтым у вядомасць. Пастарайцеся перажыць гэты шок самастойна».

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Па творы заўсёды заўважна, ці атрымаецца з маладога чалавека пісьменнік»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— А што вы маглі б сказаць наконт якасці дасланых твораў?

— Ні адзін класік не пачынаў пісаць адразу настолькі выдатна і гладка, што ніякая рэдактура не была патрэбна. Па творы заўсёды заўважна, ці можа атрымацца з маладога чалавека пісьменнік. Не ўсе з тых, хто мае задатак і адоранасць, працягваюць займацца літаратурай.

— Памятаю, выкладчыкі ў нас заўсёды пыталіся: «Навошта вы выкарыстоўваеце замежныя імёны? Чаму ваш герой жыве ў Мінску, але завуць яго Джордж?» Ці можаце вы выдзеліць тэндэнцыю, уласцівую менавіта маладым аўтарам?

— Тут многае залежыць ад моды пэўнага часу. Сапраўды, заходнія імёны сустракаюцца значна часцей, чым славянскія. Магчыма, гэта нейкая праекцыя на замежную літаратуру. У большай ступені я хацеў бы звярнуць увагу на тое, што апошнім часам творчасць маладых людзей вельмі змрочная. Чытаеш і думаеш: «Табе ж яшчэ жыць і жыць, шмат чаго наперадзе, а столькі змроку». Мабыць, гэта падлеткавая спецыфіка. Але ў вочы кідаецца.

«Я не бачу праблем, каб надрукавацца, але шмат хто з моладзі проста не ведае, што ёсць літаратурныя часопісы або конкурсы».

— У Беларусі ёсць філалагічны факультэт. Але ў адрозненне ад Расіі няма Літаратурнага інстытута. Як вы лічыце, ці маем мы ў ім патрэбу?

— Калі ў чалавека няма задатку, яго ніхто не навучыць пісаць. Я памятаю, як на філалагічным факультэце БДУ адбылася сустрэча з дэлегацыяй расійскіх пісьменнікаў. Выйшла маладая дзяўчына: «У мяне ёсць свая школа, дзе я вучу людзей пісаць — рыхтую паэтаў і празаікаў». Як можна навучыць пісаць верш? Я лічу, што гэта або дадзена або не — ты можаш сядзець і рыфмаваць, але калі ў тваім занятку няма душы і таленту, гэта заўсёды відаць. З такога чалавека пісьменніка не атрымаецца.

Пэўная адукацыя павінна быць. Мяркую, філфак, дзе вялікая ўвага аддаецца беларускай, рускай, антычнай літаратуры, з гэтым спраўляецца. Я памятаю гэтыя велізарныя спісы кніг, якія за семестр трэба было прачытаць. Навучыцца можна менавіта на класіцы, калі ты гэта прапускаеш праз сябе, зможаш нешта выбудоўваць. Спачатку павінна сфарміравацца бачанне і разуменне таго, што такое сапраўдная літаратура, а што такое масавая, ці графаманія. Калі чалавек можа адрозніць сапраўдную літаратуру ад несапраўднай, то ён здольны ацаніць і сябе.



— Ацэнка сябе — гэта, безумоўна, важна. Але часам, каб зразумець, у якім напрамку рухацца, маладому аўтару патрэбна меркаванне збоку. Гэтую ролю часцей за ўсё выконвае крытыка, але цяпер з ёй назіраюцца праблемы...

— На жаль, апошнім часам прафесійная, сур'ёзная крытыка ў нас вельмі слаба сябе праяўляе. Сярод моладзі такіх таксама адзінкі. Зараз крытыка ўвогуле сышла ў інтэрнэт — гэта не аналіз твора, які грунтуецца на веданні літаратуры і яе законаў, а ўласная ацэнка, якая не падмацавана ведамі. Тут гаворка ідзе аб суб'ектыўнасці.

«Калі чалавек можа адрозніць сапраўдную літаратуру ад несапраўднай, то ён здольны ацаніць і сябе».

— Разважаючы аб ролі інтэрнэту ў творчым полі, я ўспамінаю паэтычныя слэмы і чытанні, якія ладзіліся ў Мінску ледзь не кожны тыдзень. Іх удзельнікі не друкаваліся, але былі вельмі папулярныя сярод моладзі — у інтэрнэце іх вершы мелі шмат праглядаў, а падчас выступленняў творцаў пазнавалі. На вашу думку, гэта было абумоўлена талентам або папулярнасцю ў сеціве?

— Мне здаецца, што талент тут абсалютна ні пры чым. Гэта ўменне падаць сябе, маркетынг у чыстым выглядзе, эпатаж. Магчыма, сярод іх сустракаліся нейкія здольныя хлопцы і дзяўчаты, але ў першую чаргу тое, што адбываецца ў інтэрнэт-прасторы, — проста ўменне сябе прарэкламаваць.

— І ўсё ж у сучасным свеце недастаткова проста добра пісаць — малады аўтар павінен валодаць менеджарскімі рысамі, каб прадаць свой твор. Ці таленту дастаткова?

— Як паказвае практыка, можна выехаць і на таленце. Зразумела, што цяпер выдаць кніжку даволі цяжка. Але ў Беларусі ёсць газета «Літаратура і мастацтва», часопісы «Маладосць» і «Полымя». Для тых, хто піша на рускай мове, ёсць часопіс «Нёман». Калі твор сапраўды таленавіты, ніхто не адмовіць маладому аўтару ў публікацыі. Праводзіцца шмат конкурсаў, вынікамі якіх становяцца публікацыі ў калектыўных зборніках. Ёсць конкурс Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы», які ладзіцца раз на два гады. Па яго выніках выдаецца альманах на дзвюх мовах. Кожнае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі праводзіць свае конкурсы, якія прымеркаваны да юбілеяў пісьменнікаў ці іншых значных падзей.

Я не бачу праблем, каб надрукавацца, але шмат хто з моладзі проста не ведае, што ёсць літаратурныя часопісы або конкурсы. Яны ўсё закідваюць у інтэрнэт, дзе няма ніякага адбору і крытэрыяў.

— Якую б параду вы маглі даць маладым аўтарам? Да каго звярнуцца? Якім павінен быць першы крок?

— У першую чаргу я параіў бы больш чытаць. А калі ёсць неабходнасць у ацэнцы сваіх твораў, то зноў жа згадаю Саюз пісьменнікаў Беларусі, у прыватнасці, Мінскае абласное аддзяленне. Яго старшыня Міхась Пазнякоў праводзіць вялікую работу па аб'яднанні вакол сябе маладых літаратараў. Таксама пры кожнай ВНУ ёсць літаратурныя аб'яднанні, трэба цікавіцца і знаходзіць аднадумцаў. Абавязкова дасылайце свае творы ў часопісы, рэдактары праглядаюць усе лісты, і калі твор варты, ён будзе надрукаваны.

Арына КАРПОВІЧ.
Фота дадзена героем.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, праск. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 7.09.2022 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»

(222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б)

проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС (20 %), бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Кран-манипулятор телескопический ДЭМ-151 «UNIC», на шасси колесного трактора МТЗ «Беларус 82П», 2008 г. в., регистрационный знак ОВ-5 3974, заводской № 80205259	119454	54 324,00	5 432,00
2	Очиститель каналов навесной ОКН-05, 2012 г.в., зав.№ 119, на шасси колёсного трактора МТЗ «Беларус-1221В.2», 2012 г. в., заводской № 12036136	119597	72 792,00	7 279,00
3	Автомобиль автобус вагон ГАЗ-32213 «ГАЗель», 2008 г. в., регистрационный знак АС 0341-5, кузов № 32210090415447, Х9632213090639308, цвет бело-синий	8213	2 484,00	248,00
4	Автомобиль грузовой цистерна-топливозаправщик ГАЗ-52 АТЗ 2.4-52, 1988 г. в., регистрационный знак АО 3996-5, цвет зеленый, рама № ХТН520100J1100443	115272	2 592,00	259,00
5	Автомобиль грузопассажирский вагон УАЗ-390995-312, 2009 г. в., регистрационный знак АІ 4358-5, кузов (рама) № ХТТ390995904688891, 37410080490183, цвет тёмно-зеленый	119471	3 564,00	356,00
6	Плуг кустарниково-болотный ПБН-75	5036	1 404,00	140,00
7	Плуг ППО-4+1-40КЗ (без модуля)	5040	5 940,00	594,00
8	Плуг ППО-4+1-40КЗ (без модуля)	5041	6 588,00	658,00
9	Плуг болотный ПБН 3-50А	23026	2 484,00	248,00
10	Плуг ПГП 7-40М		3 024,00	302,00
11	Плуг ППО-4+1-40КЗ (без модуля)	119460	5 076,00	507,00
12	Плуг болотный ПБН 3-50А	119593	2 484,00	248,00
13	Борона дисковая тяжёлая Л-113-02	119462	1 728,00	172,00
14	Станок консольно-фрезерный горизонтальный 6Р83Г	200059	3 888,00	388,00
15	Станок для резки арматурной стали С-370А	200422	1 296,00	129,00
16	Станок токарно-винторезный 1В62Г	200481	4 428,00	442,00
17	Выпрямитель сварочный ВД-306М1	200796	896,40	89,00
18	Машина контактной сварки «DALEX» SL 202	200800	4 968,00	496,00
19	Машина контактной сварки «DALEX» SL 202	200803	4 968,00	496,00
20	Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3»	200811	691,20	69,00
21	Ножницы гидравлические листовые с наклонным ножом НП3716	200812	5 508,00	550,00
22	Гидравлический пресс гибочный НР-01 с ЧПУ	200817	9 828,00	982,00
23	Станок универсальный кузнечный UMT-04K с ЧПУ	200818	8 100,00	810,00
24	Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3»	200823	518,40	51,00
25	Станок отрезной маятниковый СОМ-400Б	200824	550,80	55,00
26	Сварочный полуавтомат ПДГ-211УЗ «Гефест-3»	200836	604,80	60,00
27	Инверторный сварочный полуавтомат «Mitech» MIG350 IGBT	200839	1 836,00	183,00
28	Универсальный трубогибочный станок УГС-6/1	200856	4 968,00	496,00
29	Станок ленточнопильный по металлу «Bernardo» MBS 300DG	200860	7 020,00	702,00
30	Инверторный сварочный полуавтоматический аппарат «JASIC» MIG350 (J72)	200868	2 160,00	216,00
31	Полуавтоматическая трубогибочная машина «GMACC» GM-SB-76NCB, серийный № 13237	200871	19 440,00	1 944,00
32	Станок вертикально-сверлильный 2Н125Л	201006	1 620,00	162,00
33	Станок токарно-винторезный 1М63Ф101	201011	4 968,00	496,00
34	Установка газовой резки металла НСВ 1200х2000	200862	5 076,00	507,00
35	Стол для газопламенной резки металла	200867	1 296,00	129,00

Начальная цена снижена на 10 %.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б, ул. Сухая, 89.

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иное не установлено договором купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) (покупатель) **возмещает затраты на организацию и проведение аукциона.**

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах регламентирован Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16, размещенным на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

Аукцион состоится **22.09.2022 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.09.2022** до **17.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, телефон для осмотра: 8 (029) 351 10 33.

УНП 600077220

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ЭЛЕКТРОННОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ликвидатора ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32»

(222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б)

проводит повторный открытый электронный аукцион по продаже

№ лота	Наименование	Инв. №	Начальная цена, с НДС, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
1	Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2010 г. в., регистрационный знак ОК-5 5673, заводской № У397032230410544	4540	11 682,00	1 168,00
2	Прицеп тракторный 2ПТС-4, 1989 г. в., регистрационный знак БЭ 1475, заводской № 7953	8647	792,00	79,00
3	Трактор гусеничный ДТ-75ЕМ, год выпуска не установлен, регистрационный знак ОК-5 5672	23020	1 782,00	178,00
4	Экскаватор одноковшовый ЭО-3223 «Амкодор», 2011 г. в., регистрационный знак ОК-5 3151, заводской № У39ЭО32230411682	04541	21 450,00	2 145,00
5	Агрегат комбинированный широкозахватный АКШ-6, 2009 г. в., заводской № 80	4631	5 082,00	508,00
6	Плуг болотный навесной ПБН-6-50	119600	2 376,00	237,00
7	Камнеуборочная машина УКП-0,7; 1989 г. в.	5659	7 326,00	732,00
8	Борона дисковая тяжелая Л-114 А-03 (БДТ-7), 2009 г. в.	119463	6 072,00	607,00

Стоимость снижена на 45 %.

Объекты расположены по адресу: Минская область, г. Молодечно, ул. Молодежная, 2Б.

Электронные торги состоятся *26 сентября 2022 года* в 9.00.

Заявления с прилагаемыми к ним документами на участие в электронных торгах принимаются не позднее *22 сентября 2022 года включительно до 17.00*.*

**Подача заявления на участие в электронных торгах включает в себя аккредитацию (верификацию) на электронной торговой площадке «TORGI.RLT.BY» (далее – ЭТП). Оператор ЭТП в течение 2 рабочих дней со дня заполнения заявления-анкеты на аккредитацию (верификацию) с приложением документов, предусмотренных в подпункте 2.1.5 пункта 2.1 Регламента электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY» принимает решение об аккредитации (верификации) либо отказе в аккредитации (верификации) и направляет соответствующее уведомление с использованием функциональных возможностей ЭТП и (или) электронной почты и (или) мобильного телефона, указанных при аккредитации (верификации).*

Организатор торгов и оператор электронной торговой площадки: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», адрес электронной торговой площадки: torgi.rlt.by, место нахождения: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 321.

Контактные телефоны: + 375 (17) 516-80-64, +375 (44) 789-10-18.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 608, и регламентом электронной торговой площадки «TORGI.RLT.BY», размещенным по адресу: torgi.rlt.by, и Положением «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

Продавец: ОАО «Передвижная механизированная колонна № 32» (контактный телефон: +375 (029) 351 10 33).

Консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по 22 сентября 2022 г. включительно в рабочие дни с 08.30 до 13.00 и с 13.30 до 17.00.

Задатки для участия в электронных торгах перечисляются не позднее 22 сентября 2022 года включительно на расчетный счет № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», БИК BPSBBY2X, г. Минск, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 20 (двадцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен договором купли-продажи.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомления с документацией по объектам. Осмотр объектов на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Информация о проводимых электронных торгах опубликована на сайтах: minsk-region.gov.by, rlt.by, gki.gov.by.

Предыдущие извещения были опубликованы в газете «Звязда» от 02.03.2022, 16.04.2022, 11.05.2022, 09.06.2022, 23.07.2022, 23.07.2022.

Условия аукциона: работоспособность узлов и агрегатов не проверялась, при инструментальном контроле, диагностике, разборке возможно выявление скрытых дефектов. Участник аукциона самостоятельно ознакомляется с предметом аукциона, его комплектностью, наличием документации и текущим техническим состоянием в месте его нахождения до начала торгов. Участие в торгах подтверждает факт ознакомления с предметом аукциона. Погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя. Все мероприятия по снятию с учета в органах ГАИ, Гостехнадзора и иных регистрирующих органах происходят силами и за счет покупателя по доверенности от собственника имущества.

УНП 600077220

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего учреждению «БЕЛТРАНССПЕЦАВТО» (Продавец)

Аукцион состоится **20.09.2022** в **11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Лот № 1: легковой седан MERCEDES-BENZ S500 L, кузов (рама) № WDD2211711A181081. Начальная цена без НДС – 10937,00 руб.

Лот № 2: легковой внедорожник универсал BMW X5, кузов (рама) № WBAFB91070LN97117. Начальная цена без НДС – 9415,90 руб.

Лот № 3: легковой седан MERCEDES-BENZ S500 L, кузов (рама) № WDD2211711A183875. Начальная цена без НДС – 11142,10 руб.

Лот № 4: автобус-вагон DAF BOVA кузов (рама) № XL9AB34CGY8003350. Начальная цена без НДС – 16453,51 руб.

Местонахождение Лотов: г. Минск, ул. К. Либкнехта, 54. Извещение о проведении аукциона размещено на официальных сайтах Государственного комитета по иуществу Республики Беларусь **gki.gov.by** и Организатора аукциона **ino.by.**

Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, ☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

08 сентября 2022 года в издательском доме «Звязда» опубликована проектная декларация на строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ № 5

НА СТРОИТЕЛЬСТВО ОБЪЕКТА:

««Строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи (микрорайон Липки)». II очередь строительства. Индивидуальные жилые дома, КПП, ограждение территории. II пусковой комплекс.»

Информация о застройщике

Застройщик: производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 08 ноября 2000 года № 1266, в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100011299.

Юридический (почтовый) адрес: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817.

Режим работы для приема заявлений и заключения договоров: понедельник – пятница с 9.00 до 18.00.

Производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» в качестве заказчика построило следующие объекты:

- бизнес-центр «Покровский», г. Минск, пр-т Победителей, д. 100, нежилой фонд,
- многоквартирный жилой дом, г. Минск, ул. К. Чорного, д. 25, жилой фонд,
- санаторно-курортный комплекс «Плисса», Витебская область, Глубокский район, деревня Плиса, улица Гвардейская, дом 4, нежилой фонд.

Перечень объектов, построенных за последних три года:

- храм-памятник в честь Всех Святых, г. Минск, ул. Калиновского, 121, нежилой фонд.

Информация о проекте

Проектно-сметная документация прошла государственную экспертизу в установленном порядке, получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза по Минской области» от 28.10.2020 г. № 1635-70/20.

Проектная документация разработана на основании разрешительной документации в составе:

- акт выбора места размещения земельного участка, предоставленного в постоянное пользование, утвержденного от 07.10.2019 г.;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 17.11.2020 г. № 2971;
- решение Смолевичского районного исполнительного комитета «О разрешении производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» строительства объекта» от 18.05.2021 г. № 1279.

Участок площадью 12,8621 га передан производственно-строительному закрытому акционерному обществу «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ» на основании договора аренды земельного участка от 22.11.2019 г. № 2272 для строительства жилого микрорайона. Свидетельство (удостоверение) от 02.12.2019 № 614/828-15837 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 624850100008000760.

Застройщиком по строительству объекта выступает производственно-строительное закрытое акционерное общество «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ».

Функции подрядчика индивидуального жилого дома исполняет:

по генплану № 26 (тип 10): ПС ЗАО «ТРЕСТ ПРОМСТРОЙ»;

Местонахождение объекта: в микрорайоне Липки г. Смолевичи.

Цель строительства: возведение индивидуальных жилых домов.

Этапы и сроки строительства:

- срок начала строительства объекта – IV квартал 2022 г.;
- окончание строительства объекта – IV квартал 2023 г.

Характеристика объекта: строительным проектом предусмотрено строительство жилого микрорайона в г. Смолевичи Минской области (микрорайон Липки) в количестве 85 индивидуальных жилых домов.

Общая площадь одноквартирного жилого дома по генплану № 26 (тип 10) составляет 104,7 кв. м, состоящего из 3 (трех) жилых комнат, общей площадью 37,97 кв. м. В доме 1 этаж.

Строительство объектов долевого строительства будет осуществляться в соответствии со строительным проектом и заключенными договорами создания объектов долевого строительства.

По настоящей проектной декларации для категории граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, индивидуальных предпринимателей, юридических лиц предлагаются для заключения договоров создания объектов долевого строительства следующие объекты долевого строительства:

Индивидуальный жилой дом, № по генплану	Стоимость 1 м², бел. руб.
№ 26 (тип 10)	2 703,24

- на индивидуальный жилой дом по генплану № 26.

Для лиц, заключивших договоры создания объекта долевого строительства, цена 1 кв. м, определенная в договоре, является неизменной до окончания строительства. Плата за объект долевого строительства производится дольщиком в соответствии с графиком платежей.

По согласованию сторон допускается изменение порядка расчета по оплате объекта долевого строительства с заключением дополнительного соглашения к договору.

Состав общего имущества: внутриквартальная автодорога, тротуары, сети, освещение, внутриплощадочные сети, электро-, газо- и водоснабжение, канализация, элементы благоустройства.

Более подробные сведения об объекте долевого строительства и ходом работ по его строительству можно получить по адресу: 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 100-817 или по тел. +375 29 390-01-01.

Принятие и регистрация заявлений осуществляется с первого дня с даты публикации настоящей проектной декларации. Для подачи заявления необходимо личное присутствие гражданина и его паспорт.

По истечении 7 дней с даты публикации настоящей проектной декларации и до момента набора необходимого количества заявлений, соответствующего количеству задекларированных индивидуальных жилых домов, производится заключение договоров долевого строительства. Для заключения необходимо личное присутствие дольщика и его паспорт.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 7 (семь) рабочих дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу, и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

ДОБРЫ СОН, ВІТАМІНЫ І ПЕШЫЯ ПРАГУЛКІ

Як захаваць здароўе ў пачатку восені

Восень — сапраўднае выпрабаванне для арганізма: светлавы дзень памяншаецца, імунітэт аслабляецца, а замест сонца за акном шэрасць і дождж. Але варыянты сустрэць змену сезона ў бадзёрым настроі ёсць. Пра іх мы распыталі тэрапеўта вышэйшай катэгорыі Алену БУРАК.

— Алена Міхайлаўна, як мяняецца наш арганізм восенню? Яму сапраўды патрэбна адаптацыя ці гэта адгаворкі занадта адчувальных асоб?

— З надыходам восені наш арганізм перабудоўваецца. Бо мяняецца надвор'е, зніжаецца тэмпература навакольнага асяроддзя і павялічваюцца сярэднясутачныя ваганні тэмператур. Мае свае змяненні і атмасферны ціск. Аднак асноўны фактар — скарачэнне працягласці светлавога дня. І менавіта гэта адыгрывае ключавую ролю ў змяненні нашых біялагічных рытмаў і адпаведна рабоце ўнутраных органаў.

«Гэтаму можна супрацьстаяць: шукаць станоўчыя эмоцыі, наведваць карысныя і цікавыя мерапрыемствы, сустракацца з сябрамі і людзьмі, з якімі вам прыемна кантактаваць».

Што ж прыносіць змяншэнне светлавога дня? Усім вядомы гармон мелатанін, які вырабляецца ў галаўным мозгу, з'яўляецца інфармацыйным носьбітам для ўсяго арганізма і паведамляе нашым органам і сістэмам, што адбываецца на вуліцы: дзень ці ноч, холадна ці цёпла. Са змяненнем сезона мяняецца і хуткасць метабалізму гэтага гармону, і яго колькасць. Восенню колькасць мелатаніну ў арганізме павялічваецца, і, з аднаго боку, гэтым можна растлумачыць тое, што нам больш хочацца спаць. З іншага боку, хуткасць абменных працэсаў у чалавека дастаткова высокая, і санлівасць можа вынікаць з іншых прычын.

— Ці трэба нам больш спаць увосень і зімой?

— У пачатку змены сезона такім чынам мы можам кампенсаваць сваю стомленасць і лепш адаптавацца да змены тэмператур, больш актыўнага рэжыму працы ці вучобы, і лішняя гадзіна сну, магчыма, дапаможа адчуваць сябе больш камфортна. Мы рэкамендуем нават дзённы сон, але ён мусіць быць непрацяглы — каля 30 хвілін. У норме ж начны сон аднолькавы як летам, так і зімой — сем-восем гадзін.

— Восень — час прастуд і вірусных хвароб. Як ім супрацьстаяць? Ці трэба ўжываць вітаміны і імунастымулятары?

— Сапраўды, кожнай восенню мы назіраем уздым вірусных і прастудных хвароб. Канешне, кожны з нас спадзяецца, што ўмацаваў свой імунітэт за лета. Але гэта бывае не заўсёды з-за індывідуальных асаблівасцяў, ладу жыцця і якасці харчавання. З іншага боку, восень — гэта час, калі вірусы і бактэрыі трапляюць у сваё любімае асяроддзе, вільготнае і прахалоднае, хутка

размнажаюцца і распаўсюджваюцца. Людзі вяртаюцца з адпачынкаў і дачных участкаў і ідуць у калектывы, што таксама садзейнічае хуткай перадачы вірусных інфекцый.

Што датычыцца прыёму пэўных сродкаў, то вітамінна-мінеральныя комплексы можна ўжываць без сур'ёзных прызначэнняў. Хоць лепш карыстацца натуральнымі прадуктамі, тым больш што восень багатая на іх. А вось прэпараты для павышэння работы імуннай сістэмы мусіць прызначаць урач. Яны маюць свае супрацьпаказанні, таму патрэбна хаця б мінімальнае абследаванне і кансультацыя спецыяліста. Іх уздзеянне не заўсёды такое простае і адназначнае, як можа падавацца.

— Ці трэба з надыходам халадоў мяняць свой рацыён? Ці дапамагаюць сагрэцца тлустая ежа, гарачыя супы?

— З паніжэннем тэмпературы паветра наш арганізм імкнецца сагрэцца і запасціся энергіяй, таму рацыён мяняецца незалежна ад нашага жадання, выключэнне хіба што — людзі, якія адмыслова прытрымліваюцца дыет. Сапраўды, восень і зіма — час, калі мы ўжываем больш гарачай і тлустай ежы, каб супрацьстаяць неспрыяльным умовам надвор'я. Аднак не трэба налягаць на каларыйныя прадукты, лепш імкнуцца рацыянальна харчавацца ў залежнасці ад сваіх фізічных нагрузак і штодзённай актыўнасці.

— У халодны час года мы расходуем больш энергіі альбо ўзмоцнены рацыён, наадварот, вядзе толькі да набору вагі?

— На жаль, дастаткова часта за восень—зіму многія набіраюць лішнія кілаграмы. У гэты перыяд зніжаецца наша фізічная актыўнасць і больш часу мы праводзім дома, а не на свежым паветры, у рацыёне з'яўляюцца не самыя карысныя прадукты. Таму варта сачыць за фізічнай актыўнасцю, яна мусіць быць рэгулярнай. Абярыце для сябе найбольш прымальны спосаб яе падтрымліваць: колькасць пройдзеных крокаў штодня або заняткі тры-чатыры разы на тыдзень у спартыўнай ці трэнажорнай зале, або іншы спорт, або проста штодзённыя прагулкі. Важна сачыць, колькі вы з'ядаеце і ці адпавядае гэта вашым фізічным затратам.

— Калі восенню пачынаецца выпадзенне валасоў, з чым гэта можа быць звязана і як сабе дапамагчы?

— Валасы дастаткова актыўна рэагуюць на ўсякія змены, у тым ліку сезонныя. І перш за ўсё адной з прычын павышанага выпадзення валасоў з'яўляецца зніжэнне ў арганізме колькасці вітаміну D. Таму важна падтрымліваць яго на ўзроўні нормы. Акрамя таго, селен, цынк і жалеза — асноўныя элементы, якія патрэбны для здаровай скуры, валасоў і пазногцяў. Таксама на выпадзенне валасоў могуць уплываць і змены гарманальнага спектра, у прыватнасці гармонаў шчытападобнай залозы. Таму моцнае выпадзенне валасоў — нагода звярнуцца да спецыяліста і правесці хоць бы мінімальныя абследаванні.

«У гэты перыяд зніжаецца наша фізічная актыўнасць і больш часу мы праводзім дома, а не на свежым паветры, у рацыёне з'яўляюцца не самыя карысныя прадукты. Таму варта сачыць за фізічнай актыўнасцю».

— З наступленнем халадоў і адсутнасцю сонца мяняецца і наш настрой. Што рабіць, каб не сысці ў дэпрэсіўны стан?

— Сапраўды, сырое надвор'е і воблачнасць спрыяюць таму, што настрой у нас падае, з'яўляюцца раздражнёнасць, стомленасць, санлівасць. Віной таму і гарманальныя змены, у прыватнасці сінтэз мелатаніну. Гэтаму можна супрацьстаяць: шукаць станоўчыя эмоцыі, наведваць карысныя і цікавыя мерапрыемствы, сустракацца з сябрамі і людзьмі, з якімі вам прыемна кантактаваць. Вядома, займацца фізічнай актыўнасцю, бо гэта садзейнічае выпрацоўцы рэчываў, якія паляпшаюць настрой, спальваюць лішнія калорыі і павышаюць наш жыццёвы тонус.

— Якія хранічныя захворванні абвастраюцца восенню? Каму варта ўважліва сачыць за сваім станам?

— Людзям з хранічнымі захворваннямі варта прыслухоўвацца да свайго арганізма. Змена сезонаў, у прыватнасці, восень — перыяд абвастрэння многіх хвароб у сувязі з пахаладаннем і вільготнасцю. Гэта датычыцца большасці сістэм, у тым ліку бронха-лёгачнай (у многіх пацыентаў узмацняецца кашаль) і сардэчна-сасудзістай (больш частыя гіпертанічныя крызы, болі ў вобласці сэрца). Восень — час абвастрэння гастрыту, язваў як наступства змены рэжыму харчавання, больш актыўнай працы ці вучобы і інш. Таксама гэта сезон абвастрэння артрытаў і артрозаў, для людзей з хворымі суставамі гэта вельмі неспрыяльны сезон. Таму амаль усім можна парэкамендаваць загадзя пачынаць падрыхтоўку, карэкціраваць лячэнне, параіцца з урачом наконт прафілактычных прызначэнняў, не чакаючы абвастрэння.

— Наколькі хутка адбываецца гэта перабудова — з лета на восень?

— Тут усё індывідуальна. Камусьці дастаткова тыдня, а некаму і месяца мала. Каб настроіцца на актыўны рабочы лад, мы рэкамендуем рацыянальна падыходзіць да планавання адпачынку, правільна складаць рабочы графік, прытрымлівацца рэжыму працы і адпачынку. Камусьці, магчыма, трэба ўзяць дадатковы выхадны, калі цяжка ўваходзіць у асенні актыўны рытм. Важна паўнацэнна адпачываць у выхадныя, рацыянальна харчавацца.

«Камусьці, магчыма, трэба ўзяць дадатковы выхадны, калі цяжка ўваходзіць у асенні актыўны рытм. Важна паўнацэнна адпачываць у выхадныя, рацыянальна харчавацца».

І многае залежыць ад кліматычных умоў. Часта мы назіраем надыход бабінага лета, калі надвор'е раптам паляпшаецца, а з ім — і наш настрой, а ўсе непрыемныя адчуванні самі па сабе праходзяць.

Алена КРАВЕЦ.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

Продавец: ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, Восточный переулок, 17

Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

Предмет аукциона
МАГАЗИН ВСТРОЕННЫЙ (административно-торговое помещение магазин встроенный),
общ. пл. 368 кв. м, инв. № 240/D-36384, адрес: Витебская обл., г. Орша, ул. Ивана Якубовского, 75 – 137.

Начальная цена с НДС 20 %: **118 923,03 бел. руб.** (снижена на 50 %)

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 30 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета аукциона: если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов и продавцу затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере **4 %** от цены продажи лота в течение **3 дней** после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 06.08.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 03.10.2022 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата, место и время окончания приема документов:
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **30.09.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные — **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

ГЕРВЯТЫ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ І ДЛЯ ЖЫЦЦЯ

Гервяты ў апошнія гады згадвалі ў СМІ і ў інтэрнэце ў асноўным у сувязі з будаўніцтвам і ўвядзеннем у эксплуатацыю БелАЭС. Яшчэ адна прычына, з якой кажуць пра Гервяты, — самы дасканалы, на думку мастацтвазнаўцаў, «прадстаўнік» неагатычнага стылю на тэрыторыі не толькі Беларусі, але і ў цэлым усёй Усходняй Еўропы — касцёл Святой Тройцы.

Ездзіць у Гервяты цяпер — своеасаблівы мэйнстрым: тамтэйшы касцёл стаў адной з самых папулярных архітэктурных славутасцяў Беларусі. Білборды з выявай касцёла Святой Тройцы можна ўбачыць на трасе з аэрапорта і ўздоўж цэнтральных вуліц Мінска. Арганізаваных турыстаў возяць сюды на аўтобусе, тыя, хто «самі па сабе», — дабіраюцца на машыне. Даехаць да Гервят са сталіцы без уласнага транспарту — тая яшчэ задачка. Чыгунка вільнула ўбок, і дабірацца прыходзіцца да Гудагая (тры з паловай гадзіны настальгічнай «старога ўзору» электрычкай), адтуль — аўтобусам да Астраўца, і потым зноў аўтобусам, ужо непасрэдна ў Гервяты. Зрэшты, можна выклікаць таксі альбо злавіць «папутку». У любым выпадку, хочаце абярнуцца за дзень — выязджайце з Мінска на 6.25. У гэты час летам вагоны былі практычна пустыя, і можна было ўспомніць юнацтва і падрамаць, выцягнуўшыся на сядзенні і падклаўшы заплечнік пад галаву. Але з прыходам восені пасажыраў, зразумела, стане больш.

КАСЦЁЛ

Пры наяўнасці машыны ад Гудагая да Гервят — 20 хвілін па добрай дарозе. Акуратныя аднапавярховыя домікі, векавыя высачэзныя дрэвы, і над усім гэтым — стройная постаць касцёла. На фоне ярка-блакітнага летняга неба храм выглядае сапраўды чароўна — гэткі кавалачак сярэднявечнага Парыжа. Нягледзячы на свой старадаўні выгляд, гервяцкі касцёл нельга назваць сапраўды старым. Яго будаўніцтва пачалося ў 1899 годзе і завяршылася ў 1903-м. У тыя часы ўладальнікамі Гервят быў род шляхціцаў Дамейкаў, вядомы ў беларускай гісторыі. Яны і пабудавалі касцёл. Зрэшты, з 1526 года на гэтым месцы стаяў драўляны будынак, які ўзвёў біскуп віленскі Ян. На момант пачатку будаўніцтва драўляны корпус (які, зразумела, некалькі разоў перабудоўвалі і абнаўлялі) зусім струхлеў. Архітэктар «апошняй рэдакцыі» гервяцкага касцёла — Вацлаў Міхневіч. Яго творчая спадчына — дзясяткі касцёлаў на тэрыторыі Літвы і Польшчы, многія з якіх захаваліся да нашых дзён.

Будаваўся гервяцкі касцёл хоць і хутка, але грунтоўна і ўдумліва — таму і дзівіць да гэтага часу. Выкарыстоўваліся тэхналогіі і матэрыялы, да пачатку XX стагоддзя ўжо паўсюдна практычна страчаныя. Гісторыкі пішуць, што, напрыклад, пры яго будаўніцтве выкарыстоўвалі вапну самай дробнай фракцыі, а ў «рэцэпце» будаўнічага раствора, згодна з дакументамі тых часоў, фігуравалі курыныя яйкі: іх дастаўлялі з навакольных вёсак дзясяткамі тысяч (хоць гэты апошні факт можа быць легендай — не пацвердзіў жа сучасны аналіз наяўнасць курыных яек у будаўнічым растворы Бабруйскай крэпасці). Каб будаваць з высакаякаснай цэглы, была наладжана вытворчасць у непасрэднай блізкасці ад будоўлі. Чарапіца, якой пакрываўся дах, і іншыя матэрыялы для аздаблення дастаўляліся з Заходняй Еўропы (у прыватнасці, з Германіі).



Цяпер касцёл зноў у рыштаваннях — велізарны будынак патрабуе пастаяннага клопату.

Спансіраваў будаўніцтва князь Альшэўскі — ён вылучыў на «богаўгодную справу» астранамічную па тых часах суму ў 125 тысяч рублёў срэбрам з адзінай умовай: узвесці храм не пазней, як праз чатыры гады. Паводле легенды, справа ў тым, што ў князя была любімая дачка, якая хварэла на сухоты. Лекары адмералі ёй максімум чатыры гады жыцця. І нявюцешны бацька вырашыў звярнуцца па дапамогу да нечага мацнейшага за медыцынскую навуку — наўпрост да нябёсаў. Ці выжыла дачка, невядома. А вось храму пашанцавала — ён «выжыў»: да 1939 года будынак знаходзіўся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, і «багаборцы» 1920—1930-х да яго не дабраліся. Дарэчы, гэты касцёл быў дзеючым і пасля 1939-га, служэнне тут не спынялася нават у гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта адзін з нешматлікіх касцёлаў у Беларусі, дзе ёсць дзеючы арган. У Чырвоным касцёле ў Мінску, напрыклад, аргана няма. Будавалі арган у гервяцкім касцёле з улікам унікальнай акустыкі храма, таму гучыць інструмент надзвычай велічна. У нашы дні ў храме праходзяць канцэрты арганнай музыкі.

Дарэчы, будынак, што, здаецца, «дасягае неба», і на самай справе высокі нават па мерках сучаснага горада. Вышыня яго шпіля — 61 метр (іншымі словамі, увесь будынак вышынёй прыкладна з 20-павярховы дом). Калі б касцёл знаходзіўся, скажам, у Мінску — ён і там не згубіўся б у суседстве з сучаснымі гандлёвымі і бізнес-цэнтрамі. А сярод невялікіх сельскіх хатак будынак выглядае сапраўдным волатам. Вянчае касцёл шасціметровы крыж (зрэшты, знізу ён здаецца маленькім).

— Раней тут упрытык да касцёла былі дамы і крама, — распавёў кіроўца, што падвозіў мяне да Гервят. — Потым крама згарэла, а дамы вакол касцёла рассялілі — мясцовая гаспадарка дала сваім работнікам жыллё. Потым расчысцілі пляцоўку. Бачыце, якая прыгажосць вакол касцёла? Гэта ўсё заслуга ранейшага ксяндза.

Пра настаяцеля храма, які шмат гадоў узначальваў мясцовую парафію, у Гервятах успамінаюць вельмі цёпла. Леанід Нясцюк быў пробашчам Гервяцкага касцёла два дзясяткі гадоў (ён памёр у 2017-м). За гэты час ён ператварыў навакольле храма ў сапраўдны «райскі сад» з ружамі, падстрыжанымі кустамі, вытанчанымі статуямі святых і апосталаў.

— Садоўнік тут быў вельмі добры. Як мінулы ксёндз памёр, ён і з'ехаў, вярнуўся ў родныя мясціны, кудысьці пад Нясвіж, можа быць, я дакладна не ведаю. З ім прыйшоў — з ім і сышоў, — расказаў кіроўца.

А яшчэ «мінулы ксёндз» здолеў дамагчыся аднаўлення помніка архітэктуры і зрабіў касцёл вядомым у Беларусі і за яе межамі: турыстычны паток у Гервяты павялічыўся дзякуючы яму, кажуць мясцовыя жыхары. Сённяшняя турыстычная папулярнасць касцёла ў Гервятах — усходы, якія дала сяўба настаяцеля.

Цяпер касцёл зноў у рыштаваннях — велізарны будынак патрабуе пастаяннага клопату. У храма — новы настаяцель. Праз прыемна цяністы ў спякоту «райскі сад» можна прайсці да масіўнай каванай брамы. Яе ўпрыгожвае «ўсёвідушчае вока» і назва храма, выведзеная строгай і вытанчанай лацінкай. Унутры — гулкі змрок, цішыня, на лакіраваных лавах рознакаляровыя адбіткі вітражоў у высокіх вокнах. Турыстаў пакуль — усяго двое: групы пад'едуць пазней. Яшчэ занадта рана і занадта горача. Экскурсавод распавядае двум сваім слухачам пра папярэдняга настаяцеля храма. Аб тым, як ён стварыў ландшафтны парк і колькі зрабіў, каб беларусы даведаліся аб гэтай унікальнай жамчужыне, колькі прыклаў намаганняў для аднаўлення храма. Вакол касцёла блукае фатограф, выбіраючы найбольш эфектны ракурс. Ды моладзь з Мінска — два хлопцы і дзяўчына — адпачываюць на лавачцы ў цені касцёла. Яны таксама турысты: расказалі, што прыехалі крыху раней, каб паспець да арганізаваных груп.

ГАРАДОК

У нашы дні маленькія населеныя пункты прываблівающь жыхароў вялікіх гарадоў. Мужчына, які пагадзіўся падвезці мяне з Гервят да чыгуначнай станцыі, пару гадоў таму перабраўся сюды з Мінска з сям'ёй: у яго двое дзяцей шасці і дзевяці гадоў. Прывабіла чыстае паветра плюс эканамічныя моманты — дом у вёсцы пад Гервятамі абышоўся сям'і ўсяго ў тры тысячы долараў у эквіваленце. Цяпер, распавёў суразмоўнік, цэны на нерухомасць тут вышэйшыя.

— Пакуль усім задаволеныя, і дзеці па гарадзе быццам бы не сумуюць, — кажа ён.

Мужчына дзеліцца, што, акрамя іх дома, у вёсцы яшчэ толькі два жылыя. «Алені і казулі — проста як хатнія гадаванцы, прыходзяць да нас з лесу, асабліва зімой», — кажа ён. Такі «даўншыфцінг» падыдзе не ўсім, прызнае мой спадарожнік, але яму падабаецца.

— Чаму моладзь не застаецца ў вёсцы? — разважае суразмоўнік. — Заробкі цяпер на вёсцы нармальныя, можна працаваць, але няма выхадных, і гэта многіх спыняе. Моладзь хоча кудынебудзь ездзіць, нешта бачыць, а не толькі працаваць, як старэйшае пакаленне прызвычаілася. Таму і перараздажаюць у гарады.

Леанід Нясцюк быў настаяцелем гервяцкага касцёла два дзясяткі гадоў. За гэты час ён ператварыў навакольле храма ў сапраўдны «райскі сад» з ружамі, падстрыжанымі кустамі, вытанчанымі статуямі святых і апосталаў.

Гервяты — больш старажытныя за храм, які зрабіў іх знакамітымі. Першая згадка пра іх адносіцца да 1434 года. У часы Вялікага Княства Літоўскага гэта быў амаль што «прыгарад сталіцы»: да Вільні ад Гервят — усяго каля паўсотні кіламетраў.

Цікавае назіранне: па-беларуску тут і ў нашы дні гавораць ахвотней, чым па-руску. Каб перайсці на рускую мову, мясцовым трэба зрабіць невялікае намаганне — ну прыкладна як мінчанам, каб з ходу перайсці на беларускую.

Адразу ж за агароджай касцёла ляжыць звычайная вясковая вуліца. Яна спускаецца да ідыліічнага мастка праз раку Лошу. За ракой ляжаць палі КСУП «Гервяты». А каля ракі стаіць старадаўні вадзяны млын — таксама славутасць Гервят. Праўда, ад сапраўднага млына да нашых дзён захаваўся толькі падмурак. На ім у 1980-я пабудавалі стыліза-ваны будынак. Цяпер тут двухпавярховая кавярня, прычым досыць ажыўленае: яго наведваюць і тутэйшыя, і прыезджыя. Падыходзячы да дзвярэй, чакаеш убачыць звычайную сталоўку — але ж не, утульны інтэр'ер, драўляныя столікі і люстэркі на сценах. Ад сталоўкі — толькі цэны, і гэта не можа не радаваць турыстаў, якія звыкліся з іншым цэннікам. Абед з трох страў абыдзецца ў сярэднім у 3-4 рублі. Порцыі, праўда, маленькія — звычайна ў пунктах грамадскага харчавання невялікіх населеных пунктаў яны значна большыя. Каля касцёла (дакладней, насупраць, праз дарогу) — традыцыйны «Родны кут», а таксама сувенірная крама.

Для такога маленькага населенага пункта храм, мабыць, завялікі — быццам бы «навыраст». Сёння Гервяты — аграгарадок з насельніцтвам менш за 1000 чалавек (а дакладней, крыху больш за 500), утульны і нейкі «камерны». Касцёл у Гервятах — цэнтр не толькі духоўнага жыцця, але і грамадскага. Мясцовыя жыхары распавядаюць, што ў свабодныя дні вернікі (ды і ўвогуле многія насельнікі Гервят) самі, па сваёй ахвоце і на грамадскіх пачатках прыходзяць папрацаваць на рэстаўрацыі храма. На пытанне: «Навошта гэта вам?» — выразны поціск плячыма: «У каго сумленне ёсць, ходзяць». Наогул, жаданне зрабіць сваё жыццё лепшым уласнымі рукамі — адметная і, трэба сказаць, вельмі прывабная рыса мясцовай ментальнасці. Прычым у вызначэнне «сваё жыццё» тут уключаюць і родны населены пункт, і яго навакольлі.

Напрыклад, у вольны час адзін з маіх суразмоўнікаў, мужчына сярэдніх гадоў, вырашыў расчысціць сажалку каля сваёй вёскі — уласнымі сіламі, нікуды не звяртаючыся.

— У дзяцінстве мы там купаліся, а цяпер возерка зарасло. Мы з суседзямі вырашылі расчысціць яго. Работы, вядома, не на адзін год для некалькіх чалавек — пачысціць дно, абкасіць, прыбраць паваленыя дрэвы і галіны. Але, думаю, паступова справімся.

А адзіная ў раёне дзяўчына-механізатар (проста жывая ілюстрацыя да знакамітай цытаты: «Быть можно дельным человеком и думать о красе ногтей»), распавяла аб планах развіваць б'юці-сферу свайго гарадка «без адрыву ад вытворчасці». Яна ўжо вучыцца на курсах нэйл-дызайну, хоць работу ў гаспадарцы пакідаць не мае намеру.

— Попыт на такія паслугі ў нас ёсць, а цэны ў б'юці-сферы ў маленькіх мястэчках нашмат вышэйшыя, чым у Мінску або ў тым жа Гродне. У Астраўцы майстры просяць за доўгачасовае пакрыццё пазногцяў ад 30 да 40 рублёў, за фрэнч — аж 70! І гэта яшчэ ехаць. Так што, думаю, навучуся, і ў нас у Гервятах будзе дастаткова жадаючых «зрабіць пазногці». Асабліва калі цэны будуць адэкватныя...

